РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 СТУДЗЕНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 14 (30402)

26 студзеня 2025 ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Гэта нам ТРЭБА!

## Актыўнасць на галасаванні з першых дзён – сведчанне сталасці грамадства



Курсанты Універсітэта грамадзянскай абароны галасавалі на ўчастку № 69 у сталіцы.

Фота Віктара ДРАЧОВА.

Беларусы ідуць на выбары — і гэта неаспрэчны факт. Ідуць з першага дня, як толькі гэта стала магчыма. Ужо ў першы дзень датэрміновага галасавання яўка выбаршчыкаў склала 7,81 %. У Брэсцкай вобласці ў першы дзень атрымалі бюлетэні 8,95 % грамадзян, у Віцебскай — 7,45 %, у Гомельскай — 7,01 %, у Гродзенскай — 6,08 %, у Мінскай — 8,52 %, у Магілёўскай — 7,25 %, у Мінску — 8,54 %. Па выніку двух дзён гэтыя лічбы будуць значна большыя — учора людзі ва ўсіх рэгіёнах таксама актыўна ішлі на выбарчыя ўчасткі. Людзі ідуць выбіраць будучыню для сябе і сваіх дзяцей. Яны адчуваюць адказнасць за лёс любімай краіны. Сваю асабістую адказнасць, калі дакладна разумееш, што ад твайго выбару залежыць тое, як ты будзеш жыць заўтра. Гэта называецца сталае грамадства суверэннай краіны. Мы пацвярджаем, што да гэтага ганаровага звання дараслі.

СТАР. 4–7

ВАЛАНЦЁРЫ – ПРА ВЫБАРЫ 7



АД ЧАГО АБАРОНЯЦЬ НОВЫЯ ПРЫШЧЭПКІ 15



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

НА СЛЫХУ

# ПЕНСІЯ З ПРЫБАЎКАЙ

## Міністр працы і сацыяльнай абароны аб тым, як будуць расці выплаты




Заслухоўваючы даклад па мерах удасканалення сацыяльнай абароны насельніцтва ў кастрычніку мінулага года, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў сённяшняй сітуацыі і пенсіянераў, і інвалідаў, і дзяцей-сірот варта падтрымліваць, як толькі ў дзяржавы з'яўляюцца фінансавыя магчымасці. У чарговы раз можна ўпэўніцца, што словы Прэзідэнта не разышліся са справай. Беларуская эканоміка спрацавала са станоўчым вынікам, і зробленыя сродкі было вырашана накіраваць на падтрымку найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва. Днямі кіраўніком дзяржавы быў падпісаны Указ «Аб павышэнні пенсій», згодна з якім з 1 лютага яны ўзрастуць у сярэднім на 10 %. Які у выніку будзе сярэдні памер пенсіі? Ад чаго залежыць іх павышэнне? Як сёлета будуць расці «ўзроставыя» даплаты да пенсіі? Аб гэтым «Звяздзе» расказала міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА.

СТАР. 10



## НАРОШЧВАННЕ ПРЫСУТНАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў АФРЫЦЫ І ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам спецыяльнага пасланніка кіраўніка дзяржавы Віктара Шэймана. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У ходзе размовы абмяркоўваліся пытанні нарошчвання беларускай прысутнасці на Афрыканскім кантыненце. У прыватнасці, стварэнне сумесных прадпрыемстваў, пастаўкі нашай машынабудаўнічай і харчовай прадукцыі, будаўніцтва аўтамабільных дарог і чыгунак, падрыхтоўка спецыялістаў для работы на беларускай тэхніцы, яе сэрвіснага абслугоўвання і рамонту, будаўніцтва электрастанцый.

Як далажыў Віктар Шэйман, ёсць прапановы з боку афрыканскіх партнёраў стварыць прадпрыемствы па вытворчасці і перапрацоўцы мяса птушкі і ялавічыны, малочнай прадукцыі, сельскагаспадарчыя холдынгі.

Як было падкрэслена падчас сустрэчы, Афрыка — цікавы і перспектыўны кантынент. Кіраўніком дзяржавы даручана ўзмацніць работу з выхадам на стварэнне сумесных прадпрыемстваў і заключэнне доўгатэрміновых кантрактаў.

Яшчэ адной тэмай размовы стала стварэнне ў Беларусі новых прадпрыемстваў, якія працуюць у тым ліку ў сферы штучнага інтэлекту. Гэты кірунак таксама быў адзначаны як перспектыўны. Віктар Шэйман далажыў кіраўніку дзяржавы адпаведныя прапановы.

# СТРАТЭГІЧНАЕ БАЧАННЕ, ПРАКТЫЧНЫ КЛОПАТ

## Словы Прэзідэнта, сказаныя падчас наведвання МАЗа, датычацца многіх важных тэм і, як заўсёды, трапныя

### «У ПЕРСПЕКТЫВЕ — ВЫТВОРЧАСЦЬ ПАСАЖЫРСКАЙ ТЭХНІКІ 4-ГА ПАКАЛЕННЯ»

«Я падумаў, што вы малайцы і вы заслужылі свой завод па вытворчасці аўтобусаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы, размаўляючы з калектывам МАЗа. На прадпрыемстве Прэзідэнт асабіста азнаёміўся з новай вытворчасцю, якая запрацуе ўжо ў красавіку.

У Міністэрстве прамысловасці падкрэсліваюць, што рашэнне кіраўніка дзяржавы стварыць завод па вытворчасці аўтобусаў — дальнабачнае і стратэгічнае, накіраванае на далейшае развіццё аднаго з найбуйнейшых прамысловых аб'яднанняў краіны і машынабудаўнічай галіны ў цэлым.

ААТ «МАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ» — без перабольшвання прамысловы гігант, які выпускае аўтамабільную, прычапную, пасажырскую, спецыяльную тэхніку, аўтакраны... Гэта буйны гаспадарчы комплекс поўнага тэхналагічнага цыкла, які ўключае ў сябе практычна ўсе тэхналагічныя перадзелы.

Але рэалізацыя праекта «Рэканструкцыя Аўтобуснага завода «ААТ «МАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ» вельмі важная для развіцця нават такога моцнага прадпрыемства.



«Будаўніцтва новага вытворчага корпуса і павелічэнне вытворчых магутнасцяў дазволяць павялічыць у цэлым магутнасці Мінскага аўтазавода па вытворчасці да 3 тысяч аўтобусаў за год», — расказаў «Звяздзе» **начальнік упраўлення інвестыцый і энергарэсурсаў Міністэрства прамысловасці Дзмітрый РУКШЫН.** Ён заўважыў таксама, што магутнасці новага завода дазволяць развіваць новае сямейства пасажырскай тэхнікі 3-га пакалення (МАЗ 303) і яго мадыфікацый (на дызельным паліве, кампрымiраваным і звадкаваным прыродным газе, электрапрывадзе і г. д.), а таксама ў перспектыве вытворчасць пасажырскай тэхнікі 4-га пакалення.

Дагэтуль асвойваць новыя мадэлі аўтобусаў было неперспектыўна: існыя магутнасці патрабавалі вялікіх матэрыяльных і працоўных затрат на вытворчасць такой тэхнікі. «Палепшацца і ўмовы працы людзей, — заўважае Дзмітрый Рукшын. — На новым заводзе пасучаснаму абсталяваны рабочыя месцы, выдатныя вентыляцыя і асвятленне. Да таго ж максімальна знізіцца перамяшчэнне аўтобуснай тэхнікі па тэрыторыі прадпрыемства».

### ПАПУЛІЗМ І ПУСТЫЯ АБЯЦАННІ — ГЭТА НЕ ПРА БЕЛАРУСЬ

Пра палітыку амерыканскіх улад і змену Байдэна Трампам Аляксандр Лукашэнка падчас размовы з калектывам МАЗа выказаўся вельмі ясна:

— Калі сёння адзін прэзідэнт творыць указы, а другі адмяняе — гэта што, нармальна? Гэта характарызуе краіну. Не толькі яго самога, але краіну. Значыць, у вас сур'ёзная нестабільнасць. У вас няма галоўнага — пераемнасці.



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА** звяртае ўвагу, што праблем, на якіх варта сканцэнтравацца новаму «пастаяльцу» Белага дома, хапае: спад эканомікі, рост злачыннасці, адток капіталу і многія іншыя:

— Заклапочаны ён (Дональд Трамп. — **«Зв.»**) адходам капіталу з ЗША ў краіны трэцяга свету, паколькі працоўныя месцы ствараюцца ў краінах далёкай дугі, а амерыканскія гарады пусцеюць, ператвараюцца ў гарады-прывіды. Вялікі рост наркаманіі: 300 тысяч штогод памірае ад наркотыкаў.

Звяртаючыся да замежнай палітыкі ЗША, суразмоўца адзначыў, што для нас важна, каб амерыканцы сканцэнтраваліся на вырашэнні сваіх унутраных праблем:

— Калі яны будуць вырашаць свае ўнутраныя праблемы, то ім справы не будзе да тых падзей, якія адбываюцца ва Усходняй Еўропе, якія адбываюцца ў нас. Іншымі словамі, яны адстануць ад нас са сваімі несправядлівымі прыдзіркамі з нагоды нашага курсу палітычнага развіцця, функцыянавання нашай беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі.

Адным словам, робіць выснову суразмоўца, адміністрацыі Трампа ёсць чым заняцца:

— Праблем вышэй даху. І тое, што наш кіраўнік дзяржавы на сустрэчы з працоўным калектывам МАЗа даў вельмі добры аналіз папулісцкіх заяў Трампа, нязбытных абяцанняў, вельмі паказальна. Таму што мы праводзім свае выбары для таго, каб рэалізаваць тую палітыку, прымальнасць якой ужо была ў нас вызначана і кіраўніком дзяржавы, і Усебеларускім народным сходам у папярэднія гады.

Парламентарый праводзіць паралелі:

— Я, сустракаючыся са сваімі выбаршчыкамі, аналізую, што Прэзідэнт нашай краіны абяцаў у 2020 годзе, калі ішоў на выбары, і што праз чатыры з паловай года ажыццяўлення яго паўнамоцтваў зроблена. Прэзідэнт наш абяцаў мір і бяспеку для нашай краіны — ён выканаў абяцанне. Прэзідэнт абяцаў правядзенне канстытуцыйнай рэформы — і адразу ж пасля інаўгурацыі 2020 года была створана Канстытуцыйная камісія, пачалі працаваць рабочыя групы, у нашай краіне дзейнічалі дыялогавыя пляцоўкі, праводзіліся сустрэчы з працоўнымі калектывамі, задача якіх была сабраць прапановы, заўвагі ад грамадзян у праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. І ў выніку мы 27 лютага 2022 года прыйшлі на рэспубліканскі рэферэндум і прагаласавалі за абноўленую рэдакцыю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Алег Дзячэнка падкрэслівае: гэта наша лінія. Прэзідэнт заўсёды свае абяцанні трымае:

> **— Прэзідэнт абяцаў захаваць курс на ўмацаванне сацыяльнай дзяржавы ў 2020 годзе: даступныя адукацыя, медыцына, даступнасць дасягненняў культуры і навукі, — усё гэта сёння рэалізавана. І мы бачым, колькі грошай у нас у рэспубліканскім бюджэце рэзервуецца на сацыяльныя праграмы. Гэта сапраўды сацыяльная сістэма. Ёсць пераемнасць.**

Тым больш што мы і ў Канстытуцыі замацавалі: наша беларуская дзяржава — сацыяльная.

Таксама суразмоўца звяртае ўвагу, што ў Асноўным Законе замацаваны курс на мірнае развіццё нашай краіны і на такое ж суіснаванне з іншымі краінамі і народамі:

— Падкрэсліваю: у Канстытуцыі ёсць норма, дзе сказана, што Рэспубліка Беларусь не будзе з'яўляцца крыніцай агрэсіі для суседніх краін. Прэзідэнт сказаў — усё гэта зроблена сёння. Рэспубліка Беларусь не ўдзельнічае ні ў якіх узброеных канфліктах: ні тут, ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне, ні дзесьці ў свеце. Гэта мірнае развіццё Рэспублікі Беларусь.

Дэпутат звяртае ўвагу на такі важны момант, як захаванне эканамічнага патэнцыялу і яго прымнажэнне:

— Мы захавалі ўсё: сельскую гаспадарку, машынабудаванне, лёгкую прамысловасць, усё, што звязана з развіццём навукі і тэхналогіі. Гэта сёння важны вектар развіцця, уключаючы экспартаарыентаванасць. Таму, у адрозненне ад Амерыкі, дзе, ідучы на выбары, займаюцца танным папулізмам, каб потым правесці ўсе гэтыя шоу-праграмы, наш Прэзідэнт, калі ідзе на выбары, мае заўсёды прадуманую перадвыбарную праграму, ён нічога лішняга не абяцае, таго, што не зможа выканаць.



Фота БелТА.

Традыцыйна падчас паездкі на якое-небудзь прадпрыемства Аляксандр Лукашэнка не абмяжоўваецца знаёмствам з вытворчасцю. Як правіла, кіраўнік дзяржавы ставіць стратэгічныя задачы, важныя для ўсёй краіны, а падчас размовы з калектывам закранае самыя розныя тэмы, якія цікавяць і хвалююць людзей. Не стала выключэннем і наведванне МАЗа. Мы пацікавіліся ў экспертаў, на што звярнулі ўвагу яны падчас візіту Прэзідэнта на адно з самых вядомых не толькі ў краіне прадпрыемстваў.

## «ПАСЛЯ СУСТРЭЧЫ З ПРЭЗІДЭНТАМ КАМАНДА ЗНАХОДЗІЦЦА НА ЭМАЦЫЯНАЛЬНЫМ УЗДЫМЕ»



«Сустрэча з Прэзідэнтам — гэта прадмет гонару для ўсіх членаў каманды. У першую чаргу таму, што наша дзейнасць трапіла ў поле зроку кіраўніка дзяржавы і ён ацаніў яе як важную і станоўчую. Гэта вельмі важкі момант. Кожны чалавек хоча, каб яго работу ацанілі. А калі яе ацэньвае кіраўнік дзяржавы, разумееш, што ўсё робіш не дарэмна», — падзяліўся сваімі ўражаннямі ад сустрэчы з Прэзідэнтам **начальнік каманды «МАЗ–СПОРТаўта» Сяргей ВЯЗОВІЧ.** Па яго словах, перад сустрэчай асабліва хваляваліся маладыя члены экіпажа.

«Але пасля сустрэчы мы ўсе былі перапоўнены станоўчымі эмоцыямі ад таго, што Прэзідэнт аказаўся вельмі простым у зносінах чалавекам, пагутарыў з кожным членам каманды, кожнаму паціснуў руку, выказаў пажаданні. І — што самае нечаканае — выказаў жаданне праехаць за рулём на нашым аўтамабілі. Размова атрымалася вельмі простай, нават дамашняй, і гэта ўсіх моцна ўразіла. Усе настройваліся на больш афіцыйную, строгую размову, але наша сустрэча атрымалася вельмі цёплай і сяброўскай. І яна надала хлопцам дадатковы стымул рабіць сваю справу яшчэ больш якасна і паспяхова. Пасля такіх сустрэч матывацыя вырастае ў разы. Таму цяпер усе знаходзяцца на эмацыянальным уздыме», — падзяліўся ўражаннямі Сяргей Вязовіч.

Пры сяброўскім характары сустрэчы Прэзідэнт даў камандзе сур'ёзнае даручэнне — перамагаць у спаборніцтвах высокага ўзроўню. «Сёння наш асноўны сапернік — гэта расійская каманда «КАМАЗ-майстар», перамагаць якую вельмі складана. Але нікому, акрамя нашай каманды, у апошнія гады гэта не ўдавалася. Задача няпростая, але мы ўжо яе выконвалі. Таму будзем рыхтавацца», — падкрэсліў начальнік «МАЗ-СПОРТаўта».

## «ПЫТАННЕ СА СВАІМ ТРАНСПАРТАМ СТАЯЛА ВЕЛЬМІ ВОСТРА»



Фота БелТА.

Новы аўтобус, які падарылі Прэзідэнту падчас наведвання Мінскага аўтамабільнага завода, быў створаны для найважнейшай задачы — дапамагаць людзям. Для сацыяльна-педагагічнага цэнтра з прытулкам Заводскага раёна горада Мінска, куды кіраўнік дзяржавы яго перадаў, ён стаў сапраўдным падарункам, вельмі доўгачаканым і вельмі патрэбным. «Пытанне транспарту ўжо прапрацоўвалася. Але тое, што гэта будзе аўтобус на 60 месцаў і што нам яго перадасць сам Прэзідэнт... Такога мы нават уявіць не маглі. Гэта вельмі вялікі нечаканы падарунак для нас», — падзялілася сваімі ўражаннямі **дырэктар цэнтра Іна КАНЦАВЕНКА.** Па яе словах, стаяць на месцы аўтобус дакладна не будзе. Сацыяльна-педагагічны цэнтр каардынуе ўсю работу ў раёне. Спецыялісты цэнтра працуюць з сем'ямі, у якіх дзеці прызнаны ў сацыяльна небяспечным становішчы, займаюцца рэабілітацыяй непаўналетніх, комплекснай прафілактычнай работай з дзецьмі. «У нас шмат выязных мерапрыемстваў, разнастайныя экскурсіі, наведванні тэатраў, музеяў. Нашы дзеці праходзяць медыцынскае абследаванне, і не заўсёды ў адной паліклініцы — трэба ездзіць па розных установах аховы здароўя. Раней мы ездзілі на грамадскім транспарце, што не надта зручна. Таму пытанне са сваім транспартам стаяла вельмі востра, — адзначае Іна Канцавенка. — У Заводскім раёне яшчэ ёсць спецыяльная школа-інтэрнат № 10 для дзяцей з асаблівасцямі развіцця, і, вядома, мы будзем дзяліцца аўтобусам».

У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГУ

# ЭКАНАМІЧНЫЯ ДАСЯГНЕННІ І ДАБРАБЫТ НАРОДА

### Ігар СЕРГЯЕНКА сустрэўся з калектывам ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Белаўтадар»

Спікер праінфармаваў супрацоўнікаў прадпрыемства аб заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, рабоце парламентарыяў у выбарчых акругах. Дырэктар «Белаўтадара», у сваю чаргу, расказаў аб асноўных дасягненнях холдынга, падкрэсліўшы, што ў краіне створаны ўсе ўмовы для эфектыўнай работы і рэалізацыі пастаўленых задач.
Старшыня Палаты прадстаўнікоў выказаў удзячнасць калектывам холдынга за работу па будаўніцтве рэспубліканскіх дарог, іх бяспечную эксплуатацыю і фарміраванне сучаснага аблічча Беларусі, бо, па яго словах, у тым ліку і ад стану дарог складваецца ўражанне аб краіне. «Душа радуецца, калі едзеш па нашай Беларусі», — падзяліўся спікер.



Па словах спікера, эканамічныя поспехі даюць магчымасць дзяржаве развіваць сацыяльную сферу, палепшыць узровень жыцця. У прыватнасці, аб росце дабрабыту грамадзян сведчыць тое, што колькасць аўтамабіляў, якімі валодаюць жыхары Беларусі, узрасла з 500 тысяч (на 1991 год) да 3,5 мільёна. «І дарожная інфраструктура дзякуючы вашым намаганням і прафесіяналізму гэту нагрузку дастойна вытрымлівае», — удакладніў ён. Ігар Сергяенка дадаў, што стан дарог, як і ўвядзенне бязвізавага рэжыму, садзейнічае таму, што Беларусь знаходзіцца ў лідарах па ўзроўні гасціннасці.



## «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ, ШТО НАШЫ БРЭНДЫ РАЗВІВАЮЦЦА»

Кажучы аб заканатворчасці, Ігар Сергяенка распавёў, што на бягучы момант падчас другой сесіі, якая пачала работу 17 верасня 2024 года, дэпутатамі разгледжаны 34 законапраекты. «Распрацоўка, карэкціроўка законаў у Беларусі ідзе ад жыцця, — акцэнтаваў ён увагу. — Любы законапраект папярэдне праходзіць абмеркаванне на шматлікіх пляцоўках: пасяджэннях камісій, у калектывах».

Кажучы аб профільным для дарожнікаў Законе — «Аб аўтамабільных дарогах і дарожнай дзейнасці», спікер звярнуў увагу на тое, што ён быў прыняты яшчэ ў снежні 1994 года, на світанні прэзідэнцкай рэспублікі, што, па яго словах, сведчыць аб важнасці гэтай сферы дзейнасці. «У 2025 годзе завяршаецца рэалізацыя дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі», трэба настройвацца на чарговы этап вялікай рэспубліканскай праграмы», — адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Асаблівую ўвагу Ігар Сергяенка акцэнтаваў на дасягненнях краіны за 30 гадоў. «Сёння практычна 80 % трактароў, якія выпрабляюцца ў краінах СНД, — беларускія, — канкрэтызаваў ён. — Самае галоўнае, што нашы брэнды развіваюцца. Хто б мог падумаць яшчэ дзясяткі гадоў таму, што мы ўвойдзем у пяцёрку краін-экспарцёраў малочнай прадукцыі і ў топ-15 экспарцёраў мясной прадукцыі. Больш як у 100 краін свету пастаўляецца беларуская сельскагаспадарчая прадукцыя».

## «НАША ЗАДАЧА — ПРАЦАВАЦЬ НА АПЯРЭДЖАННЕ»

Падчас сустрэчы абмяркоўвалася і найважнейшая электаральная падзея, якая гэтымі днямі праходзіць у краіне. «Вынікі першага дня паказваюць, што дастаткова актыўна ў першы ж дзень нашы людзі пайшлі на выбарчыя ўчасткі, — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Гэта сведчыць аб сталасці нашага грамадства. Але нельга забываць, што мы жывём сёння ва ўмовах інфармацыйнай вайны. Наша задача, прычым не толькі журналістаў, — данесці людзям праўдзівую інфармацыю, працаваць на апярэджанне». Асабліва важна ў гэтых умовах, на думку спікера, абараняць гістарычную праўду, захоўваць памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

У гутарцы з журналістамі Ігар Сергяенка рэзюмаваў, што на сустрэчы з супрацоўнікамі холдынга размова ішла не толькі аб поспехах дарожнага будаўніцтва, заканадаўчай базе, якая рэгламентуе работу будаўнічы-дарожнікаў. «Таксама мы казалі аб тым, якіх поспехаў дасягнула Беларусь за 30 гадоў і ў прамысловасці, і ў сельскай гаспадарцы, энергетыцы, — канкрэтызаваў ён. — Усё гэта разам садзейнічае і павышэнню якасці жыцця нашых людзей, развіццю аховы здароўя, адукацыі. Мерапрыемствы цікавае з пункту гледжання знаёмства з калектывамі, тых праблем, з якімі яны жывуць. У тым ліку сёння паступілі прапановы, якія неабходна будзе вывучыць».

Як заўважыў **кіраўнік прадпрыемства Юрый МАСЮК,** адну і тую ж інфармацыю сёння можна трактаваць па-рознаму. «Калі ж у людзей ёсць магчымасць непасрэдна мець зносіны з прадстаўнікамі ўлады такога ўзроўню, як Ігар Пятровіч, гэта дае іншы эфект, — лічыць ён. — Можна пачуць шмат інфармацыі, якая даступная не ва ўсіх крыніцах. І людзям важна, што з імі праводзяцца такія сустрэчы».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# «ГАЛАСАВАЦЬ ТРЭБА ЗА СПРАВЫ І ВЫНІК»

## Кіраўнік урада скарыстаўся магчымасцю датэрмінова выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ўзяў удзел у датэрміновым галасаванні на выбарах Прэзідэнта Беларусі, прагаласаваўшы на выбарчым участку № 39, які знаходзіцца ў гімназіі № 29 у Цэнтральным раёне Мінска. У гутарцы з журналістамі ён выказаў свой пункт гледжання на тое, як трэба рабіць выбар на карысць таго ці іншага кандыдата.



Фота БелТА.

— Галасаваць трэба за справы і вынік, а не за словы і абяцанні. Гэта відавочна. У нас ніколі не было простых умоў. На тое, што адбываецца на знешнім контуры, мы альбо можам слаба ўплываць, альбо не можам увогуле. Таму наша задача — рабіць усё магчымае ў сваёй краіне. Зрабілі мы ўжо многае, а вынікі бачныя ўсім. Таму я галасую за стабільную, мірную Беларусь, якая развіваецца, — акцэнтаваў увагу кіраўнік урада.

Прэм'ер-міністр патлумачыў, чаму вырашыў прагаласаваць датэрмінова:

— Ёсць жа добрая прыказка: «Не адкладвай на заўтра тое, што можаш зрабіць сёння». А калі казаць сур'ёзна, то асноўны дзень галасавання — найважнейшы дзень грамадска-палітычнага жыцця краіны за пяцігодку. Кандыдаты здаюць экзамен перад народам. Вядома, вельмі важна, каб гэты дзень прайшоў арганізавана, спакойна і святочна. Таму ўся вертыкаль улады будзе працаваць на месцах — кожны па сваёй зоне адказнасці забяспечвае стабільнасць правядзення грамадска-палітычнай кампаніі. Я акрама буду знаходзіцца на працоўным месцы. А вось цяпер выдалася хвіліна, таму вырашыў свой выбар зрабіць у гэты дзень.

Адзначым, што датэрміновае галасаванне праходзіць у краіне з 21 да 25 студзеня. У дні датэрміновага галасавання выбарчыя ўчасткі працуюць з 12.00 да 19.00 без перапынку. Асноўны дзень выбараў Прэзідэнта Беларусі прызначаны на 26 студзеня. Галасаванне ў дзень выбараў у нядзелю, 26 студзеня, будзе праходзіць з 08.00 да 20.00.

**Маргарыта ЗАРОЎКІНА.**

# «МЫ ВЫЗНАЧАЕМ ВЕКТАР РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ»

Яўка ў першы дзень датэрміновага галасавання — паказчык кансалідацыі ўсяго беларускага грамадства, яго палітычнай адказнасці. Аб гэтым заявіў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ пасля датэрміновага галасавання на выбарчым участку № 70 Ленінскага раёна горада Мінска, паведаміла БелТА.



Фота БелТА.

«Мы назіраем, што яўка вялікая. Гэта і ёсць паказчык кансалідацыі ўсяго беларускага грамадства, палітычнай адказнасці за будучыню сваёй краіны і разуменне таго, што, калі ты не прыйдзеш на выбарчы ўчастак, калі ты не прагаласуеш, за цябе гэта ніхто не зробіць. Значыць, будучыня ў тваіх руках», — сказаў Уладзімір Пярцоў.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі ўказаў на тое, што галасаванне ідзе актыўна і ў кожнага беларуса ёсць магчымасць прыйсці і аддаць датэрмінова свой голас. «Для гэтага створаны ўсе ўмовы. Выбарчыя ўчасткі размешчаны побач з месцам пражывання. Калі нават вы знаходзіцеся ў камандзіроўцы, усё заканадаўствам прадугледжана», — дадаў Уладзімір Пярцоў.

Ён таксама адзначыў, што заўсёды галасуе датэрмінова. «У мяне такая прывычка яшчэ з журналісцкіх часоў, калі ў дзень выбараў усе працавалі. Цяпер таксама ўвесь дзяржаўны апарат у нядзелю будзе на рабочых месцах», — падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

«Мы не проста галасуем за кандыдата ў Прэзідэнты. Мы вызначаем вектар, па якім будзе развівацца наша краіна ў наступныя гады, і каго мы бачым у якасці чалавека, які будзе, паводле нашых уяўленняў, чаканняў і спадзяванняў, такую краіну ствараць. Мы ацэньваем не толькі яркія перадвыбарныя выступленні, але і вынікі, якіх дабіліся кандыдаты», — сказаў Уладзімір Пярцоў.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта ўказаў на тое, што за 30 гадоў не памятае ніводнай выбарчай кампаніі, калі б Беларусь, яе палітычную і выбарчую сістэмы не спрабавалі дыскрэдытаваць. «Мы да гэтага ўжо прывыклі і адаптаваліся. Проста з'яўляюцца новыя пакаленні, для якіх усё гэта ў навінку. Новыя сродкі масавай камунікацыі для іх адзінае, што фарміруе іх пункт гледжання. Але калі мы будзем весці сваю суверэнную палітыку, калі будзем незалежнай краінай, то будуць тыя, каму гэта не падабаецца, хто хацеў бы бачыць нас у арэоле свайго ўплыву. Будуць і тыя, хто пры дапамозе паліттэхналогій заўсёды разгойдвае людзей унутры нашай краіны, каб яны былі адэптамі іх дзяржаўных, палітычных і карпаратыўных інтарэсаў», — падкрэсліў Уладзімір Пярцоў.

Ён таксама адзначыў, што такія спробы назіраюцца і цяпер. «Магу дакладна сказаць, што на людзей, якія прыходзяць на выбарчыя ўчасткі, на сацыяльна і палітычна актыўных грамадзян гэтыя ўкідванні ўжо не аказваюць вялікага ўплыву. Мы назіраем, недзе ўсміхаемся, а часам сур'ёзна ставімся да таго, што нашы апаненты супраць нас робяць. Але мы разумеем, што грамадства зусім іншае, якім яно было яшчэ пяць гадоў таму. Ёсць ужо прышчэпка, ёсць пэўны імунітэт і разуменне таго, у чыіх інтарэсах працуюць тыя, хто такія недружалюбныя дзеянні праводзіць», — упэўнены намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

# ШМАТЛЮДНА,

## Як праходзіць датэрміновае галасаванне на Нарачы

Выбарчая кампанія ва ўсю крочыць па краіне. У першыя дні датэрміновага галасавання на выбарчых участках без перабольшвання аншлаг. Людзі масава ідуць, каб аддаць свой голас за моцную і квітнеючую Беларусь. Радуе, што вялікая колькасць выбаршчыкаў так масава прыходзіць на свае ўчасткі не толькі ў сталіцы і абласных цэнтрах, але і ў невялікіх населеных пунктах. Карэспандэнт «Звязды» паглядзеў, якімі тэмпамі праходзіць датэрміновае галасаванне на Нарацкім выбарчым участку № 8.



КАНТЭКСТ

# «БЕЛАРУСЬ ПАД ДЫКТОЎКУ

## Суперхуткі Еўрапарламент пра непрызнанне вынікаў

Учора дэпутаты Еўрапарламента большасцю галасоў прынялі рэзалюцыю, у якой заклікалі краіны ЕС не прызнаваць вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, а таксама працягваць пашыраць санкцыі супраць Мінска.

З гэтай нагоды **прадстаўнік МЗС Беларусі Анатоль ГЛАЗ** заявіў аб найгрубейшым умяшанні Еўрасаюза ў беларускую электаральную кампанію. Ён адзначыў, што рэзалюцыя Еўрапарламента з'яўляецца найгрубейшым умяшаннем у электаральныя працэсы суверэннай дзяржавы, не мае нічога агульнага з рэальным станам спраў і заклікана аказаць ціск на свабоднае волевыяўленне беларускіх грамадзян.



Таксама Анатоль Глаз закрануў тэму прысутнасці на выбарах назіральнікаў ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ. «Ёсць інсінуацыі адносна запрашэння БДІПЧ АБСЕ назіраць за выбарамі. На ўсялякі выпадак нагадваем, што адпаведнае запрашэнне ў адрас бюро было накіравана. І 17 студзеня пацвердзіла само БДІПЧ. І яны ўсё яшчэ маюць магчымасць прыехаць», — заўважыў Анатоль Глаз. Разам з тым ён дадаў, што для беларускага боку рашэнне БДІПЧ АБСЕ не мае прынцыповага значэння, бо для назірання за выбарамі акрэдытавана ўжо больш чым 450 міжнародных назіральнікаў з 49 краін.



Што датычыцца названай рэзалюцыі Еўрапарламента, **Ала СМАЛЯК, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**, адзначае: «У нашай краіне яшчэ толькі стартавала датэрміновае галасаванне на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а дэпутаты Еўрапарламента ўжо прынялі рэзалюцыю і маюць намер заклікаць краіны Еўрасаюза не прызнаваць вынікі прэзідэнцкіх выбараў у беларускай дзяржаве».

**Парламентарый заўважыла, што непрызнанне выбараў у якой-небудзь краіне, якая не жыве па ўказцы калектыўнага Захаду, — гэта ўжо заезджаны інструмент, стандартная схема спробы еўрачыноўнікаў прадэманстраваць сваю сілу на сусветнай арэне.**

# ЯКАСНА І БЕЗ ПРАБЛЕМ

Усяго на тэрыторыі Нарацкага сельсавета — тры выбарчыя ўчасткі. Аб гэтым заявіў **старшыня Нарацкага сельвыканкама Мікалай МАРКЕВІЧ:** «Адзін выбарчы ўчастак знаходзіцца тут, у аграгарадку Нарач, на базе мясцовага Дома культуры. Два астатнія знаходзяцца ў курортным пасёлку Нарач. Хачу адзначыць, што ўсе нашы выбарчыя ўчасткі цалкам гатовыя і ўжо паспяхова прымаюць сваіх выбаршчыкаў. У першыя дні датэрміновага галасавання людзі актыўна ішлі на свае ўчасткі, асабліва ў вячэрні час».

Паводле яго слоў, усе пытанні, якія ўзнікаюць у выбаршчыкаў, хутка вырашаюцца на месцы: «У асноўным людзі цікавяцца тым, што рабіць, калі грамадзянін не можа прагаласаваць па месцы жыхарства. Пытаюцца таксама, дзе менавіта знаходзіцца іх выбарчы ўчастак. Гэтыя і іншыя пытанні тлумачым у рабочым парадку».

Участак размясціўся на базе Нарацкай сярэдняй школы № 2. Адразу на ўваходзе выбаршчыкаў сустракаюць валанцёры БРСМ. Яны арыентуюць грамадзян, дапамагаюць пенсіянерам. Падрабязней аб гэтым расказаў **старшыня Нарацкага выбарчага ўчастка № 8 Генадзь КРЫШТАФОВІЧ:** «Насельніцтва курортнага пасёлка Нарач набліжаецца да 4,5 тысячы чалавек. На тэрыторыі населенага пункта — два выбарчыя ўчасткі. Яны досыць вялікія па аб'ёме. Канкрэтна ў нашым выбарчым участку налічваецца 2372 выбаршчыкі, 11 з іх — маладыя людзі, якія будуць галасаваць упершыню. Пераважна гэта студэнты, таму чакаем іх у асноўны дзень галасавання, паколькі яны знаходзяцца на вучобе».

Гаворачы аб першых днях датэрміновага галасавання, Генадзь Крыштафовіч адзначыў, што людзі вельмі актыўныя: «Першыя грамадзяне прыйшлі літаральна адразу пасля пачатку работы выбарчага ўчастка. Упэўнены, што і далей будуць актыўна прыходзіць. Я мяркую па мінулых выбарах, бо гэта далёка не першая выбарчая кампанія, пры якой я працую ў камісіі. Таму мне ёсць з чым параўноўваць. Гэтым разам людзі цікавяцца, ці ёсць магчымасць прыйсці і прагаласаваць загадзя, яшчэ да афіцыйнага пачатку работы выбарчага ўчастка...»

Ён адзначыў, што ніякіх спрэчных момантаў, скаргаў і няштатных сітуацый пакуль не ўзнікала: «Члены камісіі, якіх разам са мной 16 чалавек, дасведчаныя, некаторыя прайшлі не адну выбарчую кампанію».

Нарацкі ўчастак для галасавання № 8 падрыхтаваны ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам, тымі метадычнымі рэкамендацыямі, якія дае ЦВК: «У нас наладжана пастаянная сувязь з усімі выбарчымі ўчасткамі краіны для таго, каб пры неабходнасці паглядзець, на якім участку павінен быў галасаваць канкрэтны грамадзянін, куды ён па выніку прыбыў, а таксама што рабіць, калі выбаршчык памяняў месца прапіскі да моманту галасавання. Людзі прыходзяць у розны час. Пенсіянеры любяць крыху раней, астатнія — у абедзенны перапынак. Акрамя таго, вакол нас размяшчаюцца санаторыі, наведвальнікі якіх таксама завітваюць. Большая частка грамадзян заходзіць у вячэрні час, пасля работы. Такая карціна складваецца абсалютна ва ўсе дні галасавання», — падагульніў Генадзь Крыштафовіч.






**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**

## ЗВОНКУ НЕ ЖЫЛА І ЖЫЦЬ НЕ ЗБІРАЕЦЦА»

### паспяшаўся заявіць нашых выбараў яшчэ да іх правядзення

«Да таго ж гэта відавочная дэманстрацыя таго, што меркаванне, інтарэсы, волевыяўленне беларускага народа для еўрачыноўнікаў не маюць ніякага значэння. У іх сістэме каштоўнасцяў ключавыя арыенціры — толькі іх амбіцыі, намеры, інтарэсы, памкненні, жаданне кантраляваць увесь свет і дыктаваць яму свае ўмовы. Але Беларусь дакладна пад дыктоўку звонку не жыла і жыць не збіраецца», — пакрэсліла Ала Смаляк.



**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Сяргей РАЧКОЎ** заявіў: «Беларускія парламентарыі абураны рэзалюцыяй Еўрапарламента па прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі. Гэты дакумент з'яўляецца грубым умяшаннем ва ўнутраныя справы нашай краіны і парушае яе электаральны суверэнітэт. Такім чынам робіцца недапушчальная спроба аказаць ціск на беларускіх выбаршчыкаў. Еўрапарламент неправамерны ацэньваць ход выбарчага працэсу ў нашай краіне, не маючы сваіх назіральнікаў і не валодаючы аб'ектыўнай паўнацэннай інфармацыяй. Тэкст рэзалюцыі напоўнены суцэльнымі выдумкамі, фэйкамі і дэзынфармацыяй. Ён не заслугоўвае ніякай увагі і тым больш разгляду. Упэўнены, што заклікі адсталага ад жыцця Еўрапарламента не прызнаваць вынікі выбараў і прадоўжыць палітыку санкцый у дачыненні да Беларусі не будуць пачуты ў свеце, які змяняецца, які ідзе па шляху паглыблення шматпалярнасці і культурнай разнастайнасці».

Выбары ў нашай краіне праходзяць на альтэрнатыўнай аснове, арганізавана і ў спакойнай канструктыўнай абстаноўцы ў поўнай адпаведнасці з беларускім выбарчым заканадаўствам, падкрэсліў парламентарый. Для міжнароднага назірання зарэгістравана больш за 500 замежных прадстаўнікоў, у тым ліку больш як 80 парламентарыяў, сярод якіх і заканадаўцы еўрапейскіх краін. «Мы поўнасцю выконваем свае міжнародныя абавязацельствы ў кантэксце арганізацыі выбарчага працэсу», — сказаў Сяргей Рачкоў.



**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім ГІГІН** у каментарыі БелТА адзначыў: «Гэта ад пачатку была замова, якая рыхтавалася яшчэ да старту выбарчай кампаніі. Іх непрызнанне нашых выбараў звязана выключна з той палітыкай — як унутранай, так і знешняй, — якую праводзіць Беларусь».

Вадзім Гігін лічыць, што падобныя ацэнкі самі па сабе з'яўляюцца ўмяшаннем ва ўнутраныя справы. «Цяпер яны проста ўсе прыстойнасці адкінулі. І, як мы бачым на Захадзе, рыторыка таго ж Трампа ці еўрапейскіх лідараў стала нават больш цынічнай. Калі раней яны спрабавалі прыкрыць свае дзеянні нейкім флёрам дэмакратычных працэдур, то цяпер і гэта не робяць. Адкрыта парушаюцца нормы дэмакратыі — напрыклад, адмена вынікаў першага тура прэзідэнцкіх выбараў у Румыніі», — звярнуў увагу ён, дадаўшы, што падобныя заявы не аказваюць ніякага ўплыву на палітычныя працэсы ў Беларусі.



**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандр ШПАКОЎСКІ** таксама бачыць геапалітычныя прычыны прыняцця падобнай абсурднай рэзалюцыі: «У першую чаргу гэта супрацьстаянне, якое цяпер разгортваецца паміж заходнім светам на чале з ЗША і Кітаем і Расіяй. Страляюць па Беларусі, а цэляцца далей. З гэтай сітуацыі міжнароднага супрацьстаяння і складваецца стаўленне Еўрапарламента да Беларусі, якая праводзіць суверэнную палітыку і выступае на баку Масквы і Пекіна ў напрамку пабудовы справядлівага шматпалярнага свету». Дэпутат упэўнены, што не трэба ўспрымаць сур'ёзна падобныя рашэнні: «Нам яны ўяўляюцца абсурднымі, скажам так. Акрамя таго, шчыра кажучы, Еўрапарламент ні на што не ўплывае па факце».

Але ж, відаць, вельмі хоча паўплываць?

## «ВЫБАРШЧЫКІ ІДУЦЬ ГАЛАСАВАЦЬ АКТЫЎНА»

### Адзначаюць міжнародныя назіральнікі Міжпарламенцкай Асамблеі СНД

Тыдзень датэрміновага галасавання пачаўся, і міжнародныя назіральнікі ад Міжпарламенцкай Асамблеі СНД прыцягваюць маніторыць выбарчыя ўчасткі. У Магілёў яны прыбылі ў аўторак вечарам, наведаўшы перад гэтым Гомель. У сераду назіральнікі азнаёміліся з работай абласной і Ленінскай раённай камісій па выбарах, наведалі некалькі ўчасткаў для галасавання.

Падчас знаходжання ў аблвыканкаме ім паведамілі, што ў вобласці 21 студзеня для датэрміновага галасавання адкрыўся 651 участак, непасрэдна ў дзень выбараў адкрыюцца дадатковыя, якія створаны ў бальніцах і дамах адпачынку. Участкі ў гэтыя дні працуюць з 12.00 да 19.00, і людзі прыходзяць на працягу ўсяго часу. **Старшыня абласной камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Яўген АЛЕКСА** запэўніў, што з боку абласной камісіі назіральнікам будзе аказана ўсялякая дапамога.

— У групу ад Міжпарламенцкай Асамблеі ўваходзяць 64 чалавекі, — паведаміла **намеснік дырэктара Міжнароднага інстытута маніторынгу развіцця дэмакратыі Алена ЯРОМЕНКА.** — Гэта сенатары, дэпутаты, прадстаўнікі сакратарыята Савета, службовыя асобы сакратарыята, эксперты Міжнароднага інстытута маніторынгу развіцця дэмакратыі і выбарчых правоў грамадзян. Мы прыехалі ў Беларусь у аўторак, наведалі 8 участкаў у Гомелі. Трэба адзначыць вялікую актыўнасць выбаршчыкаў, добрую падрыхтаванасць участкаў. Працягваем работу ў Магілёве, а на наступны дзень будзем у Віцебску.

Як адзначыла Алена Яроменка, асноўная група, якую ўзначальвае віцэ-спікер Савета Федэрацыі Расійскай Федэрацыі Канстанцін Касачоў, прыбывае ў Мінск у сераду і будзе працаваць у асноўны дзень галасавання, 26 студзеня, у Мінску і Мінскай вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

23 СТУДЗЕНЯ 2025 г.
№ 2 (15991)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



# «Прагаласаваў за будучыню...»

## Як прайшоў другі дзень датэрміновага галасавання для тых, хто ўпершыню рабіў свой выбар

Участак для галасавання № 49 Савецкага раёна сталіцы знаходзіцца ў будынку інтэрната № 11 Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Там, дзе ў звычайныя дні пануе шумная, мітуслівая і вясёлая атмасфера студэнцкага жыцця, цяпер па-асабліваму ціха, што здараецца перад любой значнай падзеяй. Маладыя беларусы, якія сабраліся ў вестыбюлі, чакалі пачатку работы выбарчай камісіі, каб рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права. Многія з іх гэта рабілі ўпершыню.

На ўчастку для галасавання ўсё гатова для пачатку працэдуры. Акрамя ўсіх неабходных атрыбутаў насупраць кожнага з членаў выбарчай камісіі — акуратныя стосікі невялікіх сініх кніжак...

— Кніга «Сімвалы суверэннай Беларусі» — гэта падарунак для юнакоў і дзяўчат, якія сёння галасуюць упершыню, — тлумачаць нам. — А яшчэ мы ўручаем ім памятныя майкі.



Члены камісіі дзеляцца тым, як прайшоў першы дзень датэрміновага галасавання:

«Прыемна здзіўлены, з якім настроем моладзь прыходзіць галасаваць. Многія нават і не хавалі свой выбар». ...На ўчастак запрашаюць першых выбаршчыкаў. Пакуль ідзе галасаванне, гутарым **са старшынёй выбарчай камісіі Віталіем ЦАНДАМ**.

— Першыя дні датэрміновага галасавання прайшлі плённа, — распавядае ён. — Да выканання свайго грамадзянскага абавязку студэнты падышлі вельмі адказна, была вялікая яўка. Ніякіх эксцэсаў не здаралася. Моладзь прыходзіла на ўчастак з добрым настроем, пакідала яго — з выдатным: яны выканалі свой грамадзянскі абавязак, да гэтага — здалі сесію і з'ехалі дадому адпачываць на канікулах.

**Віктар Кучкін, студэнт 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі**, галасаваў упершыню і адным з першых. З якім настроем юнак прыйшоў на ўчастак?

— Я галасаваў з велізарным пачуццём адказнасці за будучыню нашай краіны, — сказаў суразмоўца. — І аддаў свой голас за ўпэўненую будучыню і развіццё Беларусі.

Сябе ў гэтай будучыні Віктар бачыць дыпламаваным спецыялістам, які будзе працаваць і рабіць усё для развіцця роднай краіны.

— Студэнты галасуюць вельмі актыўна, — дзеліцца ўражаннямі **назіральнік ад партыі «Белая Русь», старшы выкладчык кафедры горных машын БНТУ Рыгор БАСАЛАЙ**. — Інакш і быць не можа, бо ўчастак для галасавання знаходзіцца на тэрыторыі вядучай тэхнічнай ВНУ краіны, а наша моладзь заўсёды адрознівалася актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Нядаўна ўніверсітэту ўручылі высокую ўзнагароду асабіста з рук Прэзідэнта, значыць, нам трэба і далей высока трымаць гэтую планку, апраўдваючы аказаны давер. Мне вельмі прыемна быць нацыянальным назіральнікам і ўдзельнічаць у такой знамянальнай падзеі, як выбары Прэзідэнта Беларусі. Гэта пачэсна. Але перш за ўсё мы выконваем сваю асноўную місію — сочым за тым, каб усё праходзіла ў адпаведнасці з заканадаўствам. Празрыста, сумленна, паважліва.



На думку назіральніка і адначасова педагога з вялікім стажам, маладыя людзі галасуюць свядома, і пераважная большасць з іх прыйшлі да разумення таго, што павінны ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны. Яны — наша будучыня, наша перспектыўная будучыня. Яны асвойваюць новыя прафесіі, ідуць у авангардзе сучасных тэхналогій. Ім будаваць моцную і квітнеючую Беларусь. Краіну, дзе маладое пакаленне будзе ствараць свае сем'і, гадаваць дзяцей.

**Студэнт БНТУ Дзмітрый Розаў** упершыню галасаваў летась на адзіным дні галасавання. Гэта ўжо яго другія выбары і першыя — Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

— Да сваёй місіі выбаршчыка стаўлюся вельмі сур'ёзна. Але настрой прыўзняты. У тым ліку і дзякуючы мерапрыемствам, якія праходзілі ў нас ва ўніверсітэце і ў цэлым па краіне, якія праццягваюцца сёння. Ішоў галасаваць, ужо ведаючы, што выберу самага годнага з кандыдатаў, які забяспечыць мір і росквіт Радзіме.

Свайго таварыша падтрымаў і **студэнт курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі Данііл Казлоўскі**:

— Я таксама ішоў на ўчастак з пэўным выбарам — за нашу краіну, яе незалежнасць, за будучыню ўсіх нас.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# Свядомы выбар

Студэнты Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна далучыліся да рэспубліканскай акцыі «Твой голас першы»

На выбарчым участку № 26, які размешчаны ў галоўным корпусе Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, актыўна галасуюць маладыя людзі — студэнты першага і другога курсаў. Яны прад'яўляюць дакументы членам участковай камісіі, ставяць подпісы ў адпаведных графах, засяроджана разглядаюць атрыманыя бюлетэні і накіроўваюцца ў кабінкі для галасавання. Затым апускаюць бюлетэні ў скрыню — упершыню ў сваім жыцці.

Пасля галасавання выбаршчыкаў запрашаюць прайсці да століка, афармленага ўніверсітэцкім камітэтам БРСМ. Тут маладых людзей віншуюць са знакавай падзеяй у жыцці і дораць сувеніры на памяць. Футболкі з назвай акцыі «Твой голас першы» некаторыя адразу прымяраюць.

Паліна Лукоўская, студэнтка першага курса факультэта замежных моў, у верасні адзначыла 18-годдзе. Дзяўчына сказала, што яна зрабіла свядомы выбар на карысць развіцця, росквіту нашай краіны.

— Для мяне не стаяла пытанне: удзельнічаць у выбарах альбо не? Наадварот, я чакала гэтай падзеі, хацелася менавіта самой узяць бюлетэнь, запоўніць яго, апусціць у скрыню, тым самым далучыцца да агульнай вялікай справы вызначэння будучыні краіны. І я гэта зрабіла, — сказала студэнтка.

Прадстаўнік камітэта БРСМ універсітэта, студэнтка другога курса факультэта прыродазнаўства Ксенія Ходар не хавала хвалявання. Яна таксама выбаршчык, а яшчэ адна з арганізатараў акцыі. Ксенія лічыць сваім абавязкам падтрымаць таварышаў, прасачыць, каб кожны з тых, хто прыйшоў на выбарчы ўчастак упершыню, атрымаў падарунак.

— Акцыя захапіла моладзь усёй вобласці, — сказаў **першы сакратар Брэсцкага абласнога камітэта БРСМ Юрый СЕГЯНЮК**. — Па сацыяльных сетках мы атрымліваем інфармацыю, фотаздымкі з Баранавічаў, Пінска, іншых гарадоў. Такая актыўнасць моладзі, студэнтаў сведчыць аб нашым адзінстве ў справе ўдзелу ў найважнейшай палітычнай кампаніі, а яшчэ — у імкненні прынесці карысць Радзіме. Удзелам у выбарах сённяшнія васямнаццацігадовыя сведчаць сваю сталасць. Калі раней яны толькі бачылі, як галасуюць бацькі, цяпер робяць гэта самі з пачуццём адказнасці за свой універсітэт, свой горад, сваю краіну. Я рады бачыць тут многіх знаёмых па ранейшых добрых справах. Юнакі і дзяўчаты паспелі паўдзельнічаць у экалагічных акцыях, у валанцёрскім руху, у будаўніцтве рэспубліканскага патрыятычнага цэнтра. Няма ніякіх падстаў сумнявацца, што яны стануць не толькі патрэбнымі для народнай гаспадаркі спецыялістамі, але і свядомымі грамадзянамі краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис»**
**(УНП 700010487, г. Могилев, ул. А. Павлова, 7)**

Аукцион состоится 07.02.2025 г. в 11:00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352 (офис Организатора аукциона)

**Лот №1: Изолированное помещение с инв. № 700/D-1599848 – Производственно-бытовой корпус**, назначение: помещение специализированное иного назначения, пл. 2598,00 кв. м, адрес: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а.
**22/100 доли капитального строения с инв. № 700/С-117992 – Промышленная площадка для стоянки автомобилей**, назначение: сооружение специализированное транспорта, пл. 17110,5 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/5.
**Капитальное строение с инв. № 700/С-118290 – Кирпичное ограждение**, назначение: сооружение благоустройства, протяженностью 115,7 м. Адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/9.
**Ковер напольный**, 2,5х2,5, инв. № 398. **Набор мебели**, инв. № 399. **Сплит-система TCL**, инв. № 2019. **Шкаф**, инв. № 119. **Котел твердотопливный КС-Т-80**, инв. № 656. **Котел твердотопливный КС-Т-80**, инв. № 657. **Холодильный шкаф**, инв. № 84. **Холодильный шкаф**, инв. № 83. **Гарнитур «Кабинет директора»**, инв. № 965. **Стенка встроенная,** инв. № 536**. Электросирена**, инв. № 3111. **Стул**, инв. № 540. **Стул**, инв. № 541. **Стул**, инв. № 542. **Стул**, инв. № 543. **Стул**, инв. № 544. **Стул**, инв. № 549.**Телефакс Panasonic kx-F130**, инв. № 477. **Телефакс Panasonic kx-F131**, инв. № 518. **Телефон Panasonic kx-FPHS**, инв. № 519. **Телефон LX-F130**, инв. № 986. **Весы МК-15.3 – А21**, инв. № 953. **Витрина ВХС-0,28 ТАИР – 1221 (1,5)**, инв. № 644. **Мармит**, инв. № 272. **Телефакс**, инв. № 2600. **Терминал Indenico ICT220 GPRS/Ethernet/ Dial-up с выносной клавиатурой д/ввода пин IPP 220 Contractless**, инв. № 963. **Факс**, инв. № 502. **Электронная плитка КЗ-0,5**, инв. № 273. **Электронный котел КПЭ 60**, инв. № 274. **Электроплита ПЭСМ-2**, инв. № 86. **Кассовый аппарат Миника 1102МИк НТС**, инв. № 954. **Кассовый аппарат Миника НТС 11**, инв. № 500002. **Кресло тканевое** – 1 шт. **Стул кожанный** – 1 шт. **Обогреватель** – 1 шт. **Обогреватель** – 3 шт. **Обогреватель** – 1 шт. **Огнетушитель** – 2 шт. **ОП-4(з) Огнетушитель** – 3 шт. **ОП-8 (з) Огнетушитель** – 10 шт. **Огнетушитель** – 1 шт. **Огнетушитель** – 2 шт. **ОП-5** – 1 шт. **Радиоприемник** б\у – 1шт. **Радиоприемник** – 1 шт. **План эвакуации на ПВХ 300мм*400мм** – 3 шт. **Флаг государственный 0,75*1,5мм** – 1шт. **Чайник эл.** – 1 шт. **Чайник электрический Aresa K-1801** – 1 шт. **Электрочайник Scarlett SC-EK-21S59 Stell** – 1 шт. **Шкаф двухстворчатый** – 2 шт. **Жалюзи вертикальное** 10,66 м кв. – 2шт. **Часы настенные Scarlett** – 1 шт. **Корзина для мусора** – 1 шт. **Удлинитель** – 1шт. **Удлинитель с сетевым фильтром 6*5 м с заземлением 10А CCA 3*0.75 600 SH-5W** – 1 шт. **Сетевой фильтр Gembird SPG 3-B-6PP** – 1шт. **Удлинитель** – 1шт. **Удлинитель** – 3 шт. **Сетевой фильтр** – 1 шт. **Телефон** – 1шт. **Сотовый телефон** – 1 шт. **Телефонный аппарат Люкс 301-3** – 1 шт. **Телефон Bg 2831 Step XL*gray Philips xenium** – 1 шт. **Светильник Дельта** – 1шт. **Светильник настольный** – 1шт. **Светильник РВО-220 6м** – 1 шт. **Сетевой фильтр Gembird SPG 3-B-6PP** – 1шт. **Вентилятор напольный** – 1шт. **Полотно пожарное** – 1 шт. **Рукав пожарный** – 46 м. **Багор пожарный** – 1 шт. **Топор пожарный** – 1 шт. **Лом пожарный** – 1 шт. **Окно ПВХ VEKA:WHS ЭО (Белый/2180*1250/S:2,725)** – 1 шт. **Радиоузел 100У-101**, инв. № 215 – 1 шт.

**Начальная цена продажи: 1 193 309,10 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка 119 330,91 бел. рублей.**

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код платежа 40901. Срок подачи документов до 12:00 06.02.2025 г. Срок подписания договора купли-продажи – 10 календарных дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится на условиях договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок и сроки внесения задатков, оформления участия в аукционе, перечень подаваемых документов, порядок проведения аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY. Доп. информацию можно получить по тел. 8(029)624-26-25, Mogilev@ino.by

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего**
**ОАО «Несвижский райагросервис»**
**(Продавец)**

Аукцион состоится **05.02.2025 г. в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.

**Лот № 1 в составе:**
1. Гараж для автомашин с инв. № 621/С-1029368, 1359,1 кв. м. Земельный участок 624283500001000082 (0,819 га). Право аренды.
2. Гараж для автомашин с инв. № 621/С-1029367, 827,4 кв. м. Земельный участок 624283500001000081 (0,1393 га). Право аренды.
3. Мехмастерские с инв. № 621/С-1029370, 1090,3 кв. м. Земельный участок 624283500001000084 (0,97 га). Право аренды.
4. Электроцех мехмастерских с инв. № 621/С-1029371, 273,5 кв. м. Земельный участок 624283500001000083 (0,26 га). Право аренды.

Адрес: Минская область, Несвижский район, Несвижский с/с, 20/3, 20, 20/2, 20/1 вблизи г. Несвиж.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 150 680,00 руб. Задаток – 115 068,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 03.02.2025 г. в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03,**
**8 (029) 550-09-52; www.gostorg.by;**
**e-mail: torgi@ino.by**

# БЫЦЬ ВАЛАНЦЁРАМ НА ВЫБАРАХ — ПАЧЭСНА

Штодзень мы робім той ці іншы выбар. Некаторым з іх мы надаем глыбокі сэнс і верым, што ад іх залежыць наш лёс. І каб зрабіць такі крок, мы доўга і адказна рыхтуемся, аналізуем магчымыя вынікі, параўноўваем, каб выбраць найлепшы варыянт. Адным з падобных з'яўляецца выбар будучыні для сваёй краіны. Выбар яе кіраўніка — Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Аднак ёсць людзі, якія загадзя прынялі яшчэ адно даволі важнае рашэнне: стаць валанцёрамі, каб у гэты адказны тыдзень усім, хто прыйдзе аддаць свой голас за будучыню краіны, было значна прасцей.

## «Нам падабаецца быць актыўнымі»



**Ганна ЦАПАР — вучаніца 11 класа Шклоўскай гімназіі. Ёй пакуль 17 гадоў, але яна ўжо цікавіцца выбарамі і выказала жаданне папрацаваць сёлета на выбарчым участку ў якасці валанцёра.**

— Мы з сяброўкамі звярнуліся ў наш раённы камітэт БРСМ і прапанавалі свае паслугі на выбарах, — расказвае Ганна. — Вельмі цікава паглядзець з боку, як праходзіць працэс галасавання.

Акрамя яе, жаданне быць валанцёрамі на выбарах выказалі яшчэ некалькі дзяўчат і юнакоў з 10–11 класаў. Гэта актыўная моладзь, якая ўдзельнічае ў грамадскім жыцці раёна, усіх маладзёжных акцыях і праектах. На думку суразмоўцы, нічога складанага ў валанцёрскай дзейнасці няма. Рабі добрую справу, і болей ад цябе нічога не патрабуецца. Магчыма, на выбарах спатрэбіцца дапамога нейкай бабульцы або чалавеку з абмежаванымі магчымасцямі. У камісіі і без гэтага хапае спраў, і трэба, каб нехта быў на падхваце. Юных памочнікаў выбарчыкі змогуць пазнаць па футболках з сімволікай БРСМ і па бэйджах, на якіх будзе пазначана: валанцёр.

— Летам мы працавалі ад БРСМ у будатрадзе, атрымалі шмат новых уражанняў ад сумеснай дзейнасці, — прыводзіць прыклад Ганна. — Нам усё цікава. Мы з сяброўкамі гатовы заўсёды прыйсці на дапамогу. І спяваем, і танцуем, і працуем усюды, куды нас запросяць.

Што датычыцца выбараў, то для краіны гэта вельмі адказны крок, лічыць школьніца.

— Важны голас кожнага, — перакананая яна. — Каб у нас было спакойнае жыццё, мірнае неба над галавой. Чалавек, які любіць сваю краіну, павінен абавязкова ўдзельнічаць у выбарах. Важна, каб як мага больш людзей выказалася за стабільнасць, за развіццё Беларусі. У нас у краіне шмат цікавых маладзёжных праграм рэалізуецца, развіваюцца спорт, культура. І мне хочацца таксама рабіць нешта важнае і патрэбнае.

## «Прадэманстраваць сваю пазіцыю»



**Лізавета АРЛОВА, педагог-арганізатар, сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ Чэрыкаўскай школы № 1 імя Героя Савецкага Саюза Я. Нікалаенкі:**

— Асабіста ў мяне ўжо ёсць вопыт работы валанцёрам на выбарах, упершыню працавала летась на Адзіным дні галасавання, — расказвае яна. — Наогул валанцёрства — адзін з кірункаў маёй работы. Два гады таму, калі я прыйшла працаваць у гэтую школу, прапанавала стварыць атрады валанцёраў. На сённяшні дзень іх два: у адзін уваходзяць піянеры 6—7 класаў, у другі, пад назвай «Міласэрнасць», вучні старшых 9—11 класаў. У кожным па 12 чалавек. Наша дзейнасць звязаная з дапамогай ветэранам, навядзеннем парадку на воінскіх пахаваннях, ратаваннем жывёл і іншымі добрымі справамі.

Летась я прапанавала раённай арганізацыі БРСМ прыцягнуць нашых школьнікаў у якасці валанцёраў на выбары. Вопыт атрымалі карысны. Дапамагалі маламабільным людзям, пажылым грамадзянам і іншым, каму спатрэбілася дапамога. Калі чалавеку было цяжка дайсці да кабінкі, суправаджалі. Быў выпадак, калі праводзілі і дадому. Дзяжурылі па два валанцёры на датэрміновым галасаванні, а ў дзень выбараў валанцёраў было болей. Дзецям падабаецца гэта дзейнасць. Іх і настаўнікі запрыкмецілі. Да таго ж яны дэманструюць усім сваю пазіцыю. У кожнага нашага валанцёра ёсць кніжка, дзе мы фіксуем іх грамадскую дзейнасць і потым запісваем у характарыстыку.

Мы ўжо падрыхтаваліся і да гэтых выбараў. Кожнаму дала памятку, дзе напісана, што павінен рабіць валанцёр. Гэта ж вельмі адказна. Падабралі дзяцей больш вынослівых, якія дакладна змогуць справіцца з абавязкамі, якім гэта цікава, якія не баяцца размаўляць з людзьмі, не саромяцца. У іх я перакананая як у самой сабе.

## «Я люблю сваю Радзіму...»



**У ліку тых, хто будзе дапамагаць сваім аднавяскоўцам на выбарчым участку, – Аліна КАРПАВА з Віцебскага раёна.**

Дзяўчына вучыцца ў 10 класе Ноўкінскай сярэдняй школы Віцебскага раёна. «Спартсменка, актывістка і проста прыгажуня» – так па канонах савецкага кінематографа характарызуюць дзяўчыну не толькі сябры, але і настаўнікі школы. І нездарма, бо акрамя выдатных поспехаў у вучобе, Аліна з'яўляецца актыўным членам школьнага і раённага БРСМ, прымае ўдзел практычна ў кожным школьным конкурсе, а яшчэ займаецца ў ваенна-патрыятычным клубе «Волат», які працуе на базе ўстановы адукацыі.

«Калі ў школе сказалі, што шукаюць валанцёраў на выбарчы ўчастак, я без сумнення згадзілася і запісалася ў шэрагі добраахвотнікаў. Чаму? Я люблю сваю Радзіму, ганаруся тым, як квітнее наша краіна. Я хачу, каб так было і надалей. Нягледзячы на тое, што мне 15 і галасаваць пакуль не маю права, я магу дапамагчы сваім аднавяскоўцам і блізкім, якія прыйдуць на выбарчы ўчастак. І ўвогуле мы з сябрамі, якія таксама будуць валанцёрамі, упэўнены, што да вялікага свята, якое плануецца ў асноўны дзень галасавання 26 студзеня, мы таксама зможам прыкласці руку і застацца ў гісторыі нашай Беларусі», – дзеліцца разважаннямі Аліна.

Дзяўчыну і яшчэ некалькі старшакласнікаў задзейнічаюць на выбарчым участку, які знаходзіцца ў Доме культуры. Таксама ноўкінскія школьнікі будуць дапамагаць на ўчастках, якія размяшчаюцца ў мясцовым сельскім Савеце і на базе Сасноўскага дома культуры. Галоўная функцыя валанцёраў – дапамагаць людзям з абмежаванымі магчымасцямі і пажылым грамадзянам прайсці на ўчастак, аказваць дапамогу маладым мамам з дзіцячымі каляскамі, быць гатовым аказаць хуткую медыцынскую дапамогу па патрэбе. Перад выбарчай кампаніяй з валанцёрамі Ноўкінскай школы правялі адукацыйныя інтэнсівы і майстар-класы. Таму Аліна, як і яе таварышы, упэўнена, што 26 студзеня ў моладзі Віцебскага раёна ўсё атрымаецца на вышэйшым узроўні.

## «Вырашаць сёння, якім будзе заўтра»

**Дзіяна ЛІЦКЕВІЧ, валанцёр на выбарчым участку № 17, УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт».**



— Рашэнне валанцёрстваваць на ўчастку прыняла імгненна, без роздумаў. Я, як і многія валанцёры, знаходжу радасць і задавальненне ў тым, што раблю, і гэта прыносіць мне шчасце. Дапамагаць людзям у розных сітуацыях у такі важны час для нашай краіны — гэта абавязак кожнага адказнага грамадзяніна. Удзел у выбарах спрыяе фарміраванню палітычнай культуры, заснаванай на дасведчанасці, актыўнасці і адказнасці грамадзян. Актыўны ўдзел можа дапамагчы разбурыць стэрэатыпы, што моладзь ці пэўныя групы насельніцтва не зацікаўленыя ў палітыцы. Таксама выбары Прэзідэнта ўплываюць на далейшы кірунак развіцця краіны, уключаючы эканоміку, ахову здароўя, адукацыю і знешнія адносіны. Голас дапамагае вызначыць, якой стане наша будучыня.

На выбарчым участку я, як валанцёр, дапамагаю арыентавацца людзям, якія прыйшлі на галасаванне. Накіроўваю іх у патрэбнае месца. Калі гэта сталы чалавек, то, безумоўна, дапамагу дайсці і падкажу якую-небудзь інфармацыю. Для мяне вельмі важна быць часткай выбарчага працэсу, паколькі мы, моладзь, — будучыня нашай краіны. Прымаючы ўдзел у галасаванні, кожны з нас аддае доўг сваёй Радзіме. Мы паказваем, што нам неабыякавы лёс нашай Беларусі. Варта вырашаць цяпер, якім будзе заўтра!

**Нэлі ЗІГУЛЯ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Сцеша АНЭЛЬСКАЯ.**
**Фота з архіва герояў.**


**Швабский сельский исполнительный комитет (Организатор аукциона) извещает о проведении 25 февраля 2025 года**

открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | **д. Юрковичи, Лесническая, д.15 А,** 623287611601000115<br>целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,1559 | Черта населенного пункта<br>Имеются сети:<br>Электрификации<br>Подъездные пути<br>водоснабжение | 3000,00 | 600,00 | 1997,93 + расходы за размещение объявления |
| 2. | **д. Молодии, ул. Загорская, д. 42,** 623287605101000394<br>целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,1678 | Черта населенного пункта<br>Имеются сети:<br>Электрификации<br>Подъездные пути | 4500,00 | 900,00 | 3455,80 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона** 25 февраля 2025 г. в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельский исполнительный комитет, контактные телефоны**: 8 (01774) 59 1 35; 59 2 35; +375(29) 1071617**

**Приём документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 (кроме субботы и воскресенья) по 20.02.2025 г. включительно;

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведении аукционов;
2. предоставить квитанцию об уплате суммы задатка;
3. предоставить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность; заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Задаток перечисляется на р/с № BY21AKBB36006191611010000000, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, г. Логойск. УНП 600537220, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901.**Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

**Ориентировочная сумма затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» ориентировочно составляет:**

1. д. Юрковичи, Лесническая, д.15А – 12970,9 бел. руб. (электроснабжение – 9770,70 бел. руб, водоснабжение – 218,20 бел. руб., транспортная инфраструктура – 2982 руб.);
2. д. Молоди, ул. Загорская, д. 42 – 12977,60 бел. руб. (электроснабжение – 9768,00 руб., транспортная инфраструктура – 3209,60 руб.).

### Извещение о проведении аукциона

**Организатор аукциона**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1

**Продавец:** ООО «Гастон Восток», 220114, г. Минск, пр-т. Независимости, 165а

| Предмет аукциона | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Легковой автомобиль внедорожник универсал Geely Emgrand X7,** р/зн. 9476 РМ-7, № кузова Y4K8762Z6EB004968, г. в. 2015, находящийся по адресу: г. Минск, пр-т Независимости 165А | 9200,00 | 460,00 |

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **24.02.2025** в 13.00 мин по адресу**: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **21.02.2025** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Шуляк Артур Леонидович, тел. 8029-123-39-49

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайтах организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (8 % от цены продажи) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные:** | **Тел. +375 44 704-92-06. Email: info@ipmtorgi.by** |

СБЕР БАНК

### Уважаемые Владельцы (физические лица)

**текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «Сбер Банк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!**

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь Банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки, будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

В отношении текущих (расчетных) счетов, открытых с 20.05.2020, а также текущих (расчетных) счетов, доступ к которым обеспечивается при использовании банковской платежной карточки, открытых с 05.05.2017, (далее – текущие счета) с 02.11.2020 Банком введен тариф за обслуживание таких счетов в случае отсутствия движения денежных средств на них при наступлении условий, предусмотренных договором об открытии текущего счета.

Операции по Счетам могут совершаться в подразделениях Банка и (или) в системе «СберБанк Онлайн».

**Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону:**
**148 – в стационарной и мобильных сетях**
**(+375 25/ 29/ 33/ 44) 5-148-148 в том числе для международных звонков**

Унп 100219673

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

# ЗНАЁМСТВА З САБОЙ І СВАЁЙ КРАІНАЙ

## «Марафон адзінства» працягвае аб'ядноўваць людзей, калектывы і пакаленні

Трэці дзень Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі ў Мінску — гэта больш за тузін адрасоў, безліч удзельнікаў ад малога да вялікага, але самае галоўнае — натхненне, якое дорыць адчуванне, што ты — частка нечага агульнага, моцнага і прыгожага, імя якому — Беларусь.
















### «РАБІЦЕ СВОЙ ВЫБАР!»

«НЯсумныя НЯлекцыі» прайшлі ў сераду ў Мінскім дзяржаўным лінгвагуманітарным каледжы, а таксама ў Мінскім каледжы інавацыйных будаўнічых тэхналогій. Іх спікерам стала **намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ.**

Да пачатку мерапрыемства студэнтам прапанавалі зрабіць выбар: пачаставацца мандарынкай або шакаладкай. Здавалася б, усё проста: што падабаецца, тое і бяры. Але нават гэты выбар пацягнуў за сабой пэўныя наступствы. Тым, хто выбраў фрукт, трэба было падчас мерапрыемства стаяць. Гэта было наглядное кароткае практыкаванне, прапанаванае Кацярынай Аляксандраўнай для студэнтаў, якое, пэўна, моцна ўразіла юнакоў і дзяўчат. На прыкладзе спікер растлумачыла, чаму важна не баяцца задаваць пытанні, пытацца пра наступствы свайго выбару. За іх, як адзначыла спікер, нясе адказнасць кожны з нас.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА** стала госцяй адной з «НЯлекцый». Яна расказала пра значэнне выбару ў яе жыцці. Студэнты не проста слухалі, але і актыўна ўступалі ў дыскусію — пыталіся, ці шкадавала госця аб нейкім выбары, якія якасці асобы лічыць найкаштоўнейшымі і што для яе значыць быць патрыётам.

Напрыканцы мерапрыемства Вольга Мікалаеўна падзялілася ўражаннямі ад «НЯсумнай НЯлекцыі». Паводле яе слоў, такі фармат камунікацыі з моладдзю вельмі надзейны. «На простых прыкладах можна данесці да дзяўчат і юнакоў сур'ёзныя рэчы. Быць спікерам і ўмець закрануць важныя для Радзімы тэмы падчас выступлення — вось што важна», — падсумавала яна.

### ДЗЕЛЯ АГУЛЬНАЙ МЭТЫ

Праект «Адну справу робім» учора аб'яднаў супрацоўнікаў прадпрыемстваў-флагманаў айчыннага легпрама — ААТ «Камволь» і ААТ «Элема», а таксама працоўныя калектывы Мінскага трактарнага і Мінскага маторнага заводаў.

Сустрэча калектываў «Элема» і «Камволь» стала незабыўным святам. Граматы і каштоўныя падарункі былі ўручаны пад дружныя апладысменты найлепшым работнікам абодвух прадпрыемстваў. Акрамя таго, працоўныя атрымалі магчымасць напрамую пагутарыць са сваімі кіраўнікамі і задаць ім хвалюючыя пытанні. Іх было шмат: аб далейшым развіцці галіны, паляпшэнні жыллёвых умоў работнікаў, падтрымцы маладых спецыялістаў. Ніводнае з іх не засталося без адказу.

— Найважнейшым рынкам для нас з'яўляецца Рэспубліка Беларусь, — падкрэсліла **генеральны дырэктар ААТ «Камволь» Юлія ГРЫНЧЫК.** — Але сваю прадукцыю мы таксама экспартуем у 12 краін свету. І тут у нас ёсць поспехі: асвоілі новыя рынкі. Ажыццёўлена адгрузка ў Кувейт, плануюцца пастаўкі ў Індыю і Ізраіль.

Кіраўнік адзначыла, што ў нашай краіне гандлёвая рознічная сетка ААТ «Камволь» і брэнда Lemongrass — восем крам, а таксама дзве — у Расіі. У бягучым годзе плануецца адкрыццё яшчэ дзвюх крам у нашай краіне і дзвюх — за яе межамі: у Маскве і Санкт-Пецярбургу.

Сустрэча калектываў МТЗ і Мінскага маторнага завода яшчэ раз даказала, што аб'яднанне намаганняў дае штуршок далейшаму развіццю абодвух прадпрыемстваў. Тым больш, як сказаў **генеральны дырэктар ААТ МТЗ Сяргей АЎРАМЕНКА**, у 2025 годзе трактарны завод чакае напружаная работа па выкананні ключавых паказчыкаў. А менавіта ўмацаванне прафесійных сувязяў з калектывамі прадпрыемстваў-партнёраў спрыяе плённасці.

### «ШЧАСЛІВАЯ, ШТО ТРАПІЛА НА ГЭТЫ КАНЦЭРТ!»

Яркія эмоцыі і памятныя падарункі атрымалі ўдзельнікі акцыі «Разам працуем, разам спяваем!»: у сераду яна прайшла ў ААТ «Мінскі электратэхнічны завод імя В. І. Казлова», ААТ «Планар» і ААТ «МотаВелаЗавод».

Прадпрыемствы разам з усёй сталіцай акунуліся ў святочную атмасферу марафону. У гэты дзень музычныя віншаванні работнікам дарылі розныя беларускія артысты, сярод якіх фальклорны гурт «Купалінка», Гюнэш, Ірына Дарафеева, салістка Вялікага тэатра Марта Данусевіч, арт-група «Беларусы», Улада, рэтра-вумен-трыа «Ружовыя ружы» і іншыя.

— Як выдатна, што наш завод стаў адной з пляцовак «Марафону адзінства». Гэта сведчыць аб вялікай павазе да чалавека працы, — заявіў перад пачаткам канцэрта **генеральны дырэктар МЭТЗ імя В. І. Казлова Аляксандр РАДЗЕВІЧ.** — 2024 год для нашага прадпрыемства вызначыўся тым, што мы выпусцілі рэкордную колькасць прадукцыі. Мы эфектыўна працуем, паспяхова развіваемся, зарабляем дастойную заработную плату. Ужо сёння ўзялі старт на новы рэкорд, і такія акцыі, як «Марафон адзінства», надаюць энергіі і натхняюць на новыя здзяйсненні. У адзінстве — сіла, у адзінстве — поспех, у адзінстве — будучыня.

Канцэртныя праграмы нікога не пакінулі абыякавым. Завадчане розных узростаў пускаліся ў скокі і з задавальненнем удзельнічалі ў інтэрактыўнай праграме.

**Выпрабавальнік Мінскага электратэхнічнага завода Анжаліка ВАХЦЭНАК** пасля запальнага танца з артыстамі фальклорнага гурта «Купалінка» падзялілася з карэспандэнтам «Звязды»: «Шчаслівая, што трапіла на гэты канцэрт! Я вельмі актыўны чалавек па жыцці, і такія музычныя падарункі мне вельмі даспадобы!».

**Майстар участка аддзела сацыяльнага развіцця МЭТЗ Аксана КАЛІНІНА,** якая таксама была адной з самых актыўных удзельніц мерапрыемства, дадала, што такія акцыі вельмі аб'ядноўваюць.

— Людзі атрымліваюць добрыя эмоцыі на ўвесь дзень, а можа быць, і на тыдзень. Яны з задавальненнем будуць падыходзіць да станкоў і працаваць, — заключыла яна.

### «ТАК МОГУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ТОЛЬКІ АПАНТАНЫЯ ЛЮДЗІ»

Адчуць Беларусь праз кіно дае магчымасць усім ахвотным выстаўка «Век беларускага кіно», што арганізавана Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм» у сталічным гандлёвым цэнтры «Palazzo». Рарытэтныя кінакамеры, рэчы, якія можна было бачыць у розных стужках, нават касцюмы герояў знакавых фільмаў уцягваюць у таямнічы свет кіно, якое за 100-годдзе напрацавала вялікую спадчыну і дапамагае зразумець...

— ...Па-першае, нашу гісторыю, — адзначае **міністр культуры Рэспублікі Беларусь Руслан ЧАРНЕЦКІ.** — Таму што на «Беларусьфільме» створана вялікая колькасць фільмаў пра Вялікую Айчынную вайну: гісторыі абсалютна розныя па сюжэце, па адлюстраваных падзеях, па эмацыянальнай напоўненасці і жанрах. І больш даўняя гісторыя была адлюстравана кінамайстрамі, напрыклад, як у фільме «Дзікае паляванне караля Стаха» паводле містычнага твора Уладзіміра Караткевіча. Калі паглядзець, што прадстаўлена на выстаўцы, а пасля больш глыбока пацікавіцца рознымі фільмамі, то можна ўбачыць, наколькі таленавітыя нашы творцы, якія стварылі шэдэўры беларускага кінематографа... Так могуць працаваць толькі апантаныя людзі, якія сапраўды хочуць пра нешта распавесці іншым. Паказаць, якія вялікія былі нашы дзяды і прадзеды, засведчыць, якімі таленавітымі з'яўляюцца цяпер іх нашчадкі. Пра гэта і распавядае выстаўка.

А вось студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў змаглі ўчора трапіць на майстар-клас акцёраў Купалаўскага тэатра. Мерапрыемства дазволіла творчай моладзі сустрэцца з майстрамі сцэны, натхніцца класікай (для іх прагучалі ўрыўкі са спектакляў «Паўлінка», «Вечар», вершы беларускіх паэтаў), пагаварыць пра тое, што ўсіх яднае, незалежна ад узросту і прафесіі.

— У нас сёння з вамі незвычайны дзень. Мне здаецца, што з гэтым мерапрыемствам, якое нас сабрала тут, вяртаецца вельмі важная і знакавая рэч для ўсіх — неабходнае ўзаемадзеянне паміж прафесійнымі акцёрамі, якія ўжо ведаюць, што такое тэатр і як там жыць, і тымі, хто рыхтуецца туды прыйсці. І гэта вельмі важна, бо спрыяе і перадачы вопыту, і пераемнасці пакаленняў, і далучае да традыцый, якія складваліся дзесяцігоддзямі ў тэатральных установах. Думаю, што з сённяшняга дня гэта цудоўная традыцыя набудзе новае дыханне, — падзяліўся міністр культуры Руслан Чарнецкі. — Такія акцыі, сустрэчы даюць матэрыял кожнаму, каб самаўдасканальвацца і навучацца. Гэта вельмі добрая і спрыяльная глеба для развіцця і працы.

У акадэміі дзяліліся сваімі думкамі пра жыццё і прафесію народныя артысткі Беларусі Марыя Захарэвіч, Тамара Міронава, заслужаны артыст Беларусі Уладзімір Рагаўцоў, а таксама маладыя купалаўцы Ілья Крук і Юлія Аўчыннікава.

### НА КАРЫСЦЬ РАДЗІМЕ

Пераможцаў Рэспубліканскага этапу адкрытага конкурсу малюнка вучняў пачатковых класаў «Мы разам», Рэспубліканскага конкурсу сачыненняў на тэму «Што такое адзінства» і Рэспубліканскага конкурсу праектаў «Мой унёсак у будучыню краіны» ўзнагародзілі ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

На працягу паўгода ва ўсіх рэгіёнах Беларусі праходзілі адборачныя этапы. У прыватнасці, у конкурсе малюнка ўзялі ўдзел больш за 150 тысяч таленавітых дзяцей. Юныя мастакі прысвячалі свае работы нашай краіне, яе багатай духоўнай спадчыне, гістарычнаму мінуламу і вялікай будучыні. Кожны малюнак — гэта не проста самавыяўленне, гэта частка адзінага палатна, якое фарміруе наша грамадства.

Дыпломам за першае месца ў намінацыі «Культурныя традыцыі беларускага народа» была адзначана **дзесяцігадовая Раіса КУЖЭЛЬ** з работай «Беларуская батлейка». Для дзяўчынкі гэта перамога стала прыемнай нечаканасцю.

— Намаляваць батлейку я вырашыла, таму што люблю хадзіць разам з класам у сваім родным горадзе — Віцебску — у тэатр «Лялька». Ён, дарэчы, тут і намаляваны. Працягваць развівацца ў творчым кірунку я буду і далей, бо мне гэта вельмі падабаецца, — падзялілася яна.

Унікальныя творчыя эсэ і крэатыўныя праекты распрацаваны сумеснымі намаганнямі моладзі, іх бацькоў і педагогаў у імкненні зрабіць нашу краіну лепш.

Завяршыўся трэці дзень марафону ў сталіцы «Знакавай сустрэчай» у ГЦ «МОМА», дзе гаварылі аб важным і адказвалі на пытанні, разыгрывалі прызы, дарылі падарункі вядомыя **беларускія журналісты Ігар ТУР** і **Рыгор АЗАРОНАК**, **радыёвядучы Вадзім ШЭПЕТ** і **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр ШПАКОЎСКІ.**

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Ларыса ЦІМОШЫК, Алена ДРАПКО, Лізавета ГОЛАД, Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД, Віктара ДРАЧОВА, Яны ВАЛАСАЧ, БелТА.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 12.781.
Нумар падпісаны ў 19.30 08.01.2025 г.

### ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (Организатор аукциона), по поручению филиала «Минский» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский» (Продавец), проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1: изолированное помещение (бокс № 1) с инв. № 600/D-136419, общей площадью 205,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, 67-1, вблизи д. Угляны.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 55 440,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены **– 5 544,00** бел. руб.

**Лот № 2: изолированное помещение (бокс № 2) с инв. № 600/D-136420, общей площадью 102,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, 67-2, вблизи д. Угляны.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 29 280,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены **– 2 928,00** бел. руб.

**Лот № 3: изолированное помещение (бокс № 3) с инв. № 600/D-136422, общей площадью 101,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, 67-3, вблизи д. Угляны.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 30 720,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены **– 3 072,00** бел. руб.

**Лот № 4: изолированное помещение (бокс № 4) с инв. № 600/D-136425, общей площадью 315,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, 67-4, вблизи д. Угляны.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 75 480,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены **– 7 548,00** бел. руб.

**Лот № 5: изолированное помещение (бокс № 5) с инв. № 600/D-136426, общей площадью 237,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, 67-5, вблизи д. Угляны.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 58 080,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены **– 5 808,00** бел. руб.

**Лот № 6: изолированное помещение (бокс № 6) с инв. № 600/D-136427, общей площадью 568,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, 67-6, вблизи д. Угляны.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 104 040,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены **– 10 404,00** бел. руб.

**Лот № 7: изолированное помещение (бокс № 7) с инв. № 600/D-136428, общей площадью 146,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, 67-7, вблизи д. Угляны.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 41 760,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены **– 4 176,00** бел. руб.

**Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 623688200001000137, площадь – 0,6148 га (постоянное пользование).**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901,** код категории платежа OTHR. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов, а также оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 18.10.2024, 05.12.2024.

Аукцион состоится **05.02.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.02.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320. **Тел: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра: (8029) 162-40-72.**

УНП 601088545

### БРЕСТСКИЙ ФИЛИАЛ РУП "ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ" извещает о проведении открытого аукциона

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб.: |
|---|---|---|
| **Лот №1: капитальное строение** с инвентарным номером 141/С-15192 (наименование: Жилой дом; назначение: Здание одноквартирного жилого дома), площадью 51,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, д. Чижевщина, ул. Центральная, 88, на земельном участке с кадастровым номером 122581505101000204, площадью 0,2390 га, составные части и принадлежности: сарай, сарай, колодец | 18 450,02 | 1 845,00 |

**Продавец:** ОАО "Рогознянский", 225111 Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Ленинский, ул. Ленина, 14, т. 80164165133. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки", г. Брест, ул. Наганова, 10-329, т/ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. Шаг аукциона: 5 % от предыдущей названной цены.

**Аукцион состоится 12 февраля 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений - 11 февраля 2025 г. до 17.00**

# ПЕНСІЯ З ПРЫБАЎКАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. )*

***— Наталля Віктараўна, каму і на колькі чакаць павелічэння пенсій з лютага?***

— Навіны аб павышэнні заўсёды чаканыя і абмяркоўваюцца. Ужо з 1 лютага нашы пенсіянеры атрымаюць істотны дадатак да пенсіі. Падкрэслю, што павялічваюцца ўсе віды працоўных пенсій: па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, з нагоды страты карміцеля. У выніку пераразліку памер працоўнай пенсіі павялічыцца ў сярэднім на 10 %.

**По папярэдняй ацэнцы, сярэдні памер пенсіі па ўзросце ў лютым бягучага года складзе 930 рублёў. Гадавое павелічэнне, калі лічыць з лютага 2024-га да лютага 2025-га, складзе 120 рублёў, ці 14,8 %.**

Памер павелічэння працоўнай пенсіі ў кожнага пенсіянера будзе свой у залежнасці ад працягласці стажу і велічыні заробку, улічаных пры вылічэнні яму пенсіі, а таксама ўстаноўленых даплат да асноўнай пенсіі. Усяго атрымальнікамі працоўных пенсій у краіне з'яўляюцца больш як 2,3 мільёна пенсіянераў.

У цэлым у лютым расходы на выплату пенсій складуць каля 2,2 мільярда рублёў, з іх на павышэнне пенсій будзе накіравана 196 мільёнаў. Калі браць выдаткі за год, то на пенсіённыя выплаты прадугледжана амаль 26 мільярдаў рублёў, гэта плюс 3,3 мільярда ў параўнанні з мінулым годам.

***— Колькі павышэнняў чакаць сёлета пенсіянерам?***

— Казаць аб колькасці пераразлікаў працоўных пенсій у 2025 годзе пакуль заўчасна. Аднак нагадаю, летась іх было два: з лютага — на 10 % і з кастрычніка — на 5 %.

**Таксама звяртаю ўвагу, што чатыры разы на год — у лютым, маі, жніўні і лістападзе — з ростам бюджэту пражытачнага мінімуму будуць павялічвацца яшчэ і «ўзроставыя» даплаты да пенсіі.**

Дарэчы, з 1 студзеня 2025 года таксама павысіліся пенсіі для дзяцей-інвалідаў, якія да 18 гадоў страцілі аднаго з бацькоў. Памер павышэння залежыць ад ступені страты здароўя. Гэтыя пенсіі прывязаны да бюджэту пражытачнага мінімуму, і павелічэнне складзе ад 80 да 110 % БПМ — ад 374 да 515 рублёў.

Дадатковыя гарантыі атрымаюць па прызначэнні датэрміновай пенсіі і таты дзяцей-інвалідаў, якія ажыццяўляюць выхаванне і догляд дзіцяці без удзелу маці. Так, датэрміновую пенсію ўзамен маці прызначаць бацьку пры дасягненні ім 58-гадовага ўзросту пры ўмове пацвярджэння факта выхавання дзіцяці-інваліда не менш як восем гадоў да яго паўналецця, стажу работы не менш як 25 гадоў, з якіх не менш як пяць гадоў работы з выплатай страхавых узносаў, што мы называем страхавым стажам.

Новаўвядзенні закрануць і шматдзетныя сем'і. Для маці, якія нарадзілі і выхавалі чацвярых дзяцей да васьмігадовага ўзросту, уводзяцца льготныя ўмовы прызначэння пенсіі, а менавіта ўстанаўліваецца далейшае зніжэнне страхавога стажу з дзесяці да пяці гадоў.

***— Наколькі ахвотна беларусы карыстаюцца праграмаміназапашвальнай пенсіі, больш вядомымі як «Тры плюс тры» і «Адкладзеная пенсія»?***

— Назапашвальныя пенсіі з фінансавай падтрымкай дзяржавы — адзін з дадатковых механізмаў для камфортнай старасці, які рэалізуецца ў нашай краіне. Іх накопліваюць ужо больш за 45 тысяч чалавек. Сярод удзельнікаў пераважаюць жанчыны, якіх больш за 70 %. Адметна, што каля 64 % удзельнікаў выбралі тарыф «Тры плюс тры».

Цікавасць да праграмы найперш праявілі беларусы, да выхаду на пенсію якім засталося прыкладна 5-10 гадоў. Менавіта ў гэтым узросце людзі ўжо сур'ёзна задумваюцца аб маючым адбыцца новым этапе жыцця.

Акрамя таго, для пенсіянераў, якія працуюць, эфектыўным механізмам павелічэння даходаў у будучыні з'яўляецца праграма «Адкладзеная пенсія», што дазваляе сфарміраваць дадатковую прэмію за больш позні пачатак атрымання пенсіі. Сёння такой праграмай скарысталася звыш пяці тысяч пенсіянераў.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Гражданин Республики Беларусь Бончук Михаил Владимирович |

**Предмет электронного аукциона:**
**100 % доли в уставном фонде ООО «Фантом Плюс»**
(в состав которой входят 100 % доли в уставном фонде Продавца)

**Начальная цена без НДС – 2 300 000 евро.**
«У асноўным гэта вынік плённай работы маркетолагаў і тэхнолагаў, — звяртае ўвагу кіраўнік прадпрыемства. — Маркетолагі аналізуюць і прагназуюць як унутраны, так і экспартныя рынкі, уносяць прапановы мне. Тэхнолагі набываюць сыравіну для навінкі, ствараюць новы прадукт у лабараторыі, прапаноўваюць яго на дэгустацыю. Дэгустацыйная камісія і прымае рашэнне, пускаць гэты прадукт у вытворчасць або не. Ствараем у першую чаргу тое, што выклікае эмоцыю, а эмоцыя вымушае здзейсніць пакупку».

За шырокі асартымент і высокую якасць прадукцыі «Лідскія харчовыя канцэнтраты» прызнаны «Лідарам спажывецкага рынку — 2024». Як высвятляецца, захоўваць якасць прадукцыі ў сучасных умовах неверагодна складана. «Гэта каштуе вялікіх намаганняў працоўнага калектыву, — кажа Вячаслаў Гарбачоў. — Абавязковы ўваходны кантроль сыравіны (і мікрабіялагічны, і арганалептычны), а таксама кантроль якасці на выхадзе. У 2024 годзе, аб'яўленым Годам якасці, мы ўдасканаліліся і ў частцы лабараторнага абсталявання. Пастаянна мадэрнізуемся. Невыпадкова наша прадукцыя запатрабавана не толькі на ўнутраным рынку, але і за мяжой — мы сябе зарэкамендавалі найперш высокай якасцю».

### Насуперак і дзякуючы санкцыям

Супрацоўнікі не адчуваюць наступстваў санкцый, уведзеных супраць Беларусі, у тым ліку прадпрыемства. Хоць, як удакладняе гендырэктар ААТ «Лідахарчканцэнтраты», санкцыі паўплывалі на работу з Заходняй Еўропай.

«Мы пераарыентаваліся, — дадае Вячаслаў Гарбачоў. — Ключавым экспартным рынкам па-ранейшаму з'яўляецца Расійская Федэрацыя. Наступны па значнасці — рынак Кітайскай Народнай Рэспублікі. Нашу прадукцыю спажываюць у Казахстане, Узбекістане, Арменіі, Азербайджане. З некаторымі краінамі працуем у двухбаковым парадку: мы адгружаем ім гатовую прадукцыю, яны нам — сыравіну. Працуем з Канадай, Германіяй, Латвіяй, Эстоніяй, Бахрэйнам, Ізраілем, іншымі — экспартны рынак дастаткова шырокі. Магчыма, дзякуючы санкцыям мы ідзём у краіны далёкай дугі, Афрыкі».

Аднак у прыярытэце — унутраны рынак. Як і 80 гадоў таму, калі прадпрыемства рабіла свае першыя крокі, «Лідскія харчовыя канцэнтраты» паспяхова забяспечваюць харчовую бяспеку краіны.

### ЦЭХ ПА ВЫТВОРЧАСЦІ ПРЫПРАЎ І ВОСТРЫХ ПРЫПРАЎ



На ўчастку прыправаў і вострых прыправаў ад смачных пахаў кружыцца галава. Як заўважае **начальнік участка Генадзь МЛЕЧКА,** справа ў эфірных маслах, якія выдзяляюцца падчас перапрацоўкі сыравіны. Гэта сведчыць аб натуральнасці прадукцыі.

«Працуем толькі з сыравінай экстра- і прэміум-класа, — расказвае ён. — Вырабляем тыя прыправы, якія карыстаюцца попытам у кожнай гаспадыні. Асабліва палюбіліся ім прыправы маркі «Tvitnik» — у іх вы ўвогуле не знойдзеце солі. Уплывае на попыт і сезоннасць. У перыяд нарыхтовак папулярныя монапрыправы: духмяны перац, чорны перац, гваздзіка».

За суткі на ўчастку ствараецца да шасці тон прыправаў, вострых прыправаў і спецый. Як прызнаецца **аператар участка Валянціна ВАРАБЕЙ,** супрацоўнікі прызвычаіліся да смачных пахаў. «Дома самі карыстаемся нашымі прыправамі, рэкамендую — не пашкадуеце, — кажа яна». Валянціна Варабей працуе на прадпрыемстве на працягу 38 гадоў. «Лідахарчканцэнтраты» — першае і адзінае працоўнае месца жанчыны. Прыйшла сюды пасля заканчэння тэхнікума, працавала на розных участках, але, галоўнае, ніколі не хацела памяняць ні від дзейнасці, ні месца работы.

На прадпрыемстве працуе 320 чалавек. Сярод іх — нямала дынастый. Сярэдні заробак вышэйшы за сярэдні па раёне. Сацыяльны пакет уключае медыцынскае страхаванне, матэрыяльныя выплаты да свят, для іншагародніх прадугледжаны інтэрнат.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

УНП 500021268




# ЗАКОН АБО РЭКАМЕНДАЦЫЯ?

## Амерыканская «дэмакратыя» і санкцыі ў дачыненні да МКС

**На фоне соцень рашэнняў, прынятых Д. Трампам адразу ж пасля яго інаўгурацыі ў якасці 47-га прэзідэнта ЗША, практычна без увагі СМІ засталіся перыпетыі, звязаныя з Міжнародным крымінальным судом (МКС). Арганізацыя, якая дазволіла сабе выдаваць ордэры на арышт кіраўнікоў дзяржаў, сама апынулася пад амерыканскімі санкцыямі, якія былі прыняты Кангрэсам 9 студзеня 2025 года і ўвайшлі ў сілу ў выніку адмены ўказаў Байдэна 21 студзеня 2025 года.**

Такі вынік стаў следствам рознагалоссяў у пазіцыях МКС і амерыканскай эліты. «Міжнароднаму» суду было дазволена надзімаць шчокі і выдаваць ордэры ў дачыненні да афрыканскіх палітыкаў, Прэзідэнта Расіі, але не ў дачыненні да Вашынгтона і яго саюзнікаў.

### НЕ ЧАПАЙ СВЯТОЕ!

У верасні 2018-га Джон Болтан, тагачасны памочнік Трампа па нацыянальнай бяспецы, аб'явіў аб магчымасці ўвядзення санкцый супраць супрацоўнікаў МКС на фоне расследаванняў злачынстваў амерыканцаў у Афганістане, якія працягваюцца, і парушэнняў закона Ізраілем у дачыненні да палестынцаў.

У сакавіку 2019 года дзяржсакратар М. Пампеа папярэдзіў, што ЗША гатовыя адмовіць у выдачы віз службовым асобам МКС, якія непасрэдна адказваюць за вядзенне расследаванняў у дачыненні супраць амерыканскіх вайскоўцаў і грамадзянскіх асоб. Больш за тое, ён таксама заявіў, што «ўлады ЗША не дапусцяць, каб амерыканцам пагражаў орган, які прадстаўляе сабой пародыю на правасуддзе».

Нарэшце, першае папярэджанне, або «жоўтую картку», у дачыненні да МКС вынес Д. Трамп падчас свайго першага прэзідэнцкага тэрміна ў 2020 годзе, дазволіўшы ўводзіць санкцыі супраць супрацоўнікаў МКС, «што ўдзельнічаюць у расследаваннях, якія Вашынгтон лічыць незаконнымі». Ва ўказе ён падкрэсліў, што «дзеянні МКС пагражаюць суверэнітэту Злучаных Штатаў, а таксама іх саюзнікаў, якія не падтрымліваюць Рымскі статут і не прызнаюць юрысдыкцыі МКС». «У нас ёсць важкія падставы меркаваць, што на найвышэйшых узроўнях кіраўніцтва Міжнароднага крымінальнага суда маюць месца карупцыя і неправамерныя дзеянні, што ставіць пад сумненне аб'ектыўнасць расследаванняў у дачыненні да амерыканскіх вайскоўцаў», — гаворыцца ў заяве, апублікаванай на сайце Белага дома.

Трамп даручыў кіраўніку Мінфіна ЗША і дзяржаўнаму сакратару Майку Пампеа выкарыстоўваць палажэнні новага ўказа для абароны інтарэсаў краіны. У прыватнасці, гаворка ішла аб замарозцы актываў супрацоўнікаў МКС у юрысдыкцыі ЗША і забароне на іх уезд на тэрыторыю краіны. Уведзеныя абмежаванні былі адменены 46-м прэзідэнтам ЗША Байдэнам, аднак Д. Трамп не забыўся пра «міжнароднае бюракратычнае балота».

### ДА АДКАЗНАСЦІ

Ужо ў лістападзе 2024 года саветнік Д. Трампа па нацыянальнай бяспецы Майкл Уолтц у сваім акаўнце ў сетцы X напісаў: «МКС і ААН атрымаюць канчатковы адказ ад ЗША за антысемітызм з-за іх рашэння арыштаваць прэм'ер-міністра Ізраіля Біньяміна Нетаньяху і былога кіраўніка Мінабароны краіны Ёава Галанта. Ізраіль законна абараняў свой народ і граніцы ад генацыдных тэрарыстаў».

Нядзіўна, што 9 студзеня 2025 года Палата прадстаўнікоў амерыканскага кангрэса падтрымала законапраект аб санкцыях у дачыненні да Міжнароднага крымінальнага суда (МКС) у Гаазе. Дакумент падтрымалі 243 члены ніжняй палаты заканадаўчага органа, 140 выступілі супраць. Законапраект, які атрымаў назву «Акт супрацьдзеяння нелегітымнаму суду», быў унесены больш як 60 кангрэсменамі-рэспубліканцамі на чале з членам Палаты прадстаўнікоў Чыпам Роем.

Рэстрыкцыі плануецца ўводзіць за любыя спробы МКС садзейнічаць «расследаванню, арышту, затрыманню або судоваму праследаванню любой асобы, якая знаходзіцца пад абаронай Злучаных Штатаў і іх саюзнікаў». Санкцыі прадугледжваюць адмову ў выдачы віз і забарону на дзелавыя кантакты з асобамі, уключанымі ў чорны спіс.

Акрамя таго, паводле інфармацыі газеты The Guardian, рыхтуюцца жорсткія эканамічныя санкцыі. Гэта датычыцца, у прыватнасці, магчымага блакіравання доступу суда да банкаўскіх і плацежных сістэм, IT-інфраструктуры і страхавых кампаній. Такія меры не дазволяць амерыканскім кампаніям весці бізнес або транзакцыі з судом, што можа паралізаваць яго работу і паставіць пад пагрозу само існаванне МКС.

### А СУДДЗІ ХТО?

На фоне дзясяткаў указаў Д. Трампа, тэма МКС практычна згубілася, але гэта нагляднае папярэджанне ўсім прыхільнікам шматпалярнага свету. Гегемон не збіраецца здаваць свае пазіцыі без бою. Пакуль любы міжнародны арганізм працуе па амерыканскіх правілах, ён дэмакратычны і легітымны, нават калі ён нічога не робіць і існуе намінальна (як МКС), аднак любая прэтэнзія на незалежнасць робіць яго ізгоем.

Пры гэтым дэмакратыя і «вяршэнства закона» адразу ж забываюцца, а арганізацыя прызнаецца «не вартай даверу». Ні меркаванні экспертаў, ні праваабаронцаў, ні міжнародных інстытутаў не прымаюцца да ўвагі.

На гэтым фоне ляманты праваабаронцаў выклікаюць толькі ўсмешку: «Пагрозы суду падрываюць давер да сістэмы міжнароднага правасуддзя і паслабляюць імкненне да справядлівасці».

Сёння свет уступіў у фазу турбулентнасці, калі сіла становіцца асноўным сродкам прасоўвання геапалітычных інтарэсаў. Рашэнне амерыканскага кангрэса — яркае таму пацвярджэнне.

Час усвядоміць, што ў «свеце, заснаваным на правілах», якіх рэальна няма, трэба спадзявацца выключна на сябе і сваіх саюзнікаў. Сёння адсутнічаюць «незалежныя» арганізацыі, а да любых «патрабаванняў, заяў, рэкамендацый» міжнародных цэнтраў і супольнасцяў варта падыходзіць выключна з пункту гледжання забеспячэння ўласных нацыянальных інтарэсаў. Ацэньваць працэсы ўнутры ўласнай краіны — прэрагатыва народа, прымаць рашэнні аб мэтазгоднасці ўдзелу ў міжнародных арганізацыях — права суверэнных дзяржаў, якое не павінна падмяняцца нечымі рэкамендацыямі.

Жыць сваім розумам, самастойна прымаць рашэнні і рэалізоўваць іх на карысць грамадства і дзяржавы без аглядкі на «замежнага дзядзьку» — у гэтым сутнасць урока, які варта атрымаць з гісторыі МКС. Ніхто, акрамя нас саміх, не зробіць наша жыццё лепшым, а найважнейшы крок у гэтым кірунку — усвядомлены выбар Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 26 студзеня 2025 года.

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, доктар ваенных навук, прафесар.**

### Тым часам

Аб тым, што санкцыі Захаду супраць Беларусі ніякім чынам не паўплываюць на дзяржаўны лад, а толькі на эканоміку (што, уласна, Захаду і трэба, каб аслабіць канкурэнтаў) і на дабрабыт простых людзей, пачынаюць разумець і збеглыя, у якіх яшчэ захавалася крытычнае мысленне. «Патрыярх апазіцыі ў выгнанні» Зянон Пазняк у інтэрв'ю аднаму з ютуб-каналаў так выказаўся з гэтай нагоды: «Еўрасаюз, асабліва Германія, праводзіць паслядоўную палітыку па знішчэнні Беларусі... Усе гэтыя паны шольцы і іншыя, яны цудоўна ведаюць, што робяць. А падтрымку гэтай палітыкі робяць офісы (збеглых. — «Зв.») Найбольш шкодны — гэта Латушка. Каго вы душыце? Сваю дзяржаву, свой народ».

**И З В Е Щ Е Н И Е**
**о проведении электронных торгов по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома**

**Организатор электронных торгов:** Дукорский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Дукора, ул. Речная,14, тел. 8(01713)63935, 31636.

**Оператор электронной торговой площадки**: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»

**Электронный адрес электронной торговой площадки**: www.et.butb.by

Дата проведения электронных торгов: **24 февраля 2025 года**

**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Беларусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| Адрес земельного участка | Кадастровый номер земельного участка с расположенным на нем незаконсервированным капитальным строением | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена предмета аукциона (в т. ч. незавершенный строительством жилой дом/ зем. участок) (рублей) | Задаток, (руб.) | Затраты (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Минская область, Пуховичский р-н, аг. Дричин, ул. Дружная, уч. 1** | 624483402001000341, объем (площадь) строения 829 куб. м (кв. м), готовность строения — 6 %, фундамент бутобетон | 0,1500 | Сети электроснабжения, водоснабжения газоснабжения | 11592,22 (4782,22/6810,00) | 1159,22 | 1465,82 |

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» в г.Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. Назначение платежа: внесение суммы задатка на участие в торгах. Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами – 19 февраля 2025 года до 15.00.

Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр предмета аукциона на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник – пятница, 8.30 – 13.00, 14.00 – 17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 г. № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

внести плату за предмет аукциона, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

УНН 600177864

**И З В Е Щ Е Н И Е**
**о проведении электронных торгов по продаже земельных участков гражданам Республики Беларусь в частную собственность.**

**Организатор электронных торгов:** Дукорский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Дукора, ул. Речная,14, тел. (801713)63935, 31636.

**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»

**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by

Дата проведения электронных торгов: **24 февраля 2025 года**

**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Беларусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена (рублей) | Задаток, руб. | Расходы по подготовке документации (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Минская область, Пуховичский р-н, аг. Дукора, ул. Садовая, 23Б** | 624483402101001740 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 0,1266 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 18000,00 | 1800 | 2575,36+ стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| **Минская область, Пуховичский р-н, аг. Дричин, ул. Парковая, 10** | 624483402001000323 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 0,1500 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 7000,00 | 700,00 | 1638,03+ стоимость объявления в СМИ и ЭТП |

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» в г.Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. Назначение платежа: внесение суммы задатка на участие в торгах. Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами – 19 февраля 2025 года до 15.00.

Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник – пятница, 8.30 – 13.00, 14.00 – 17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 г. № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

внести плату за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

УНН 600177864

Сведения о результатах проведения рекламной игры

## «ВЫЕЗЖАЙ НА СМАРТФОНЕ. НОВОГОДНИЙ ТУР»

**Сведения об организаторе:**
Общество с ограниченной ответственностью «ПАЛОМА СЕРВИС», зарегистрированное 30.01.2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 690017072, УНП 690017072, место нахождения: 220020, г. Минск, пр-т. Победителей, д. 100, пом. 2, электронный адрес: info@nasvyazi.by.

**Наименование рекламной игры:** «Выезжай на смартфоне. Новогодний тур».

**Срок начала и окончания рекламной игры:** с 2 декабря 2024 года по 28 февраля 2025 года.

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** свидетельство о регистрации № 4488 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 12 ноября 2024 г.

**Сведения о количестве участников рекламной игры:** 16600.

**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:** призовой фонд разыгран полностью.

**Фамилия, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши):**

| № розыгрыша | Фамилия, инициалы | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Изотова В. П. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Завершинских В. Э. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Полещук А. Н. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Гапеенко В. В. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Хотайт А. Х. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Калинин М. Г. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Шарич Д. В. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Сенько Д. В. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Корнейчук Е. В. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Стебихова Г. Н. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Масальский М. А. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Пищ В. Б. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Сочилович А. А. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Борисевич С. С. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Шавров В. Л. | Денежные средства в размере 1 149,43 бел. руб. |
| 1 | Ковалевская А. А. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Ловчиновский А. А. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Евдокимова Е. В. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Зыков А. Ю. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Гудков Д. В. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Шмигельский Н. Д. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Солофин Е. Н. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Кумагеочик Г. Н. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Боева А. С. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Разгонова М. А. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Черняк Д. В. | Денежные средства в размере 5 747,13 бел. руб. |
| 1 | Ясюченя О. В. | Денежные средства в размере 5 747,13 бел. руб. |
| 1 | Попов А. О. | Денежные средства в размере 5 747,13 бел. руб. |
| 1 | Минкевич Д. Д. | Денежные средства в размере 5 747,13 бел. руб. |
| 1 | Нестерович В. В. | Денежные средства в размере 5 747,13 бел. руб. |
| 1 | Белоусова И. И. | Денежные средства в размере 11 494,25 бел. руб. |
| 1 | Арабей К. С. | Автомобиль легковой BMW I3 40L Night, белый, двигатель HA0001N0, VIN: LBV81CZ03R1A73441, стоимостью 103 492,87 бел. руб. Денежные средства в размере 15 464,45 бел. руб. |

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:** +375 (29) 3030303.

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
(Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на три года имущества, принадлежащего
**ГААСУ «АВИАЦИЯ»** (Продавец).

Аукцион состоится **25.02.2025 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.

**Лот № 1**: Право заключения договора аренды:
1. Хранилище технического имущества № 1 с инв. № 600/С-41980. Площадь: 322,4 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Липковская,12/2.
2. Хранилище технического имущества № 2 с инв. № 600/С-41981. Площадь: 265,9 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Липковская,12/4.
3. Хранилище технического имущества № 3 с инв. № 600/С-42904. Площадь: 312,8 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Липковская,12/3.
4. Хранилище технического имущества № 2 с инв. № 600/С-41982. Площадь: 261,8 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Липковская,12/5.

Начальная цена с НДС 20 % – 6 195,94 руб.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by**
**e-mail: torgi@ino.by**



СКАЖЫЦЕ, ДОКТАР...

# СУПРАЦЬ ПНЕЎМАКОКА, КОКЛЮШУ І ВПЧ

## Інфекцыяніст – пра новыя прышчэпкі

З гэтага года прынята рашэнне аб унясенні ў Нацыянальны каляндар прышчэпак вакцынацыі супраць яшчэ трох інфекцый: ВПЧ (віруса папіломы чалавека), пнеўмакокавай інфекцыі і дадатковая рэвакцынацыя супраць коклюшу. Чаму менавіта гэтыя прышчэпкі былі дададзены ў Нацыянальны каляндар, тлумачыць урач-інфекцыяніст 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі Дар'я ПЕТРАЧУК.



***— Наколькі небяспечная пнеўмакокавая інфекцыя і для каго асабліва?***

— На мой погляд, вакцынацыя была неабходная, асабліва для немаўляці. Да 2025 года прышчэпку бясплатна атрымлівалі толькі дзеці з груп рызыкі па цяжкім ходзе гэтай інфекцыі.

Пнеўмакокавая інфекцыя — рэспіраторнае захворванне, якое праяўляецца цыркуляцыяй пнеўмакока ў насаглотцы, альбо развіццём захворвання ў выглядзе неінвазійных формаў. Напрыклад, вострага сярэдняга атыту і пнеўманіі без бактэрыяміі альбо інвазійных формаў — сепсісу, гнойнага менінгіту, пнеўманіі з бактэрыяміяй, эндакардыту, перыкардыту, артрыту, астэаміэліту. Найбольш схільныя да развіцця клінічна значных форм пнеўмакокавай інфекцыі дзеці першых пяці гадоў жыцця.

У дзяцей да двух гадоў пнеўмакок сябе паводзіць вельмі агрэсіўна і выклікае ў асноўным генералізаваныя формы інфекцыі, таму так важна абараніць немаўля як мага раней. Таксама ўгэтай групы верагодны ўскладненні. У 54 % выпадкаў страта слыху звязана з перанесеным пнеўмакокавым менінгітам. Пасля пнеўмакокавага менінгаэнцэфаліту ў 15 % выпадках застаецца сутаргавы сіндром, паралічы, затрымка разумовага развіцця, а ў 30 % выпадкаў маюцца неўралагічныя парушэнні.

СААЗ рэкамендуе трохдозавую схему вакцынацыі, пачынаючы з узросту 6 тыдняў. Такая схема будзе выкарыстоўвацца і ў нас: вакцынацыя з дзвюх доз у першым паўгоддзі жыцця з бустарам у год.

***— Растлумачце, навошта дадатковая прышчэпка ад коклюшу.***

— Да 2025 года апошняя рэвакцынацыя супраць коклюшу была ў дзяцей у 18 месяцаў. А з гэтага года будзе яшчэ і дадатковы бустар у шэсць гадоў. Гэтай тэндэнцыі прытрымліваецца ўвесь свет, каб падоўжыць імунітэт ад дадзенай інфекцыі, і наша краіна не з'яўляецца выключэннем.

Інфекцыя вельмі каварная: тыповы «стадзённы кашаль» з'яўляецца не адразу, і спярша хворы не будзе мець ніякіх адметных прыкмет коклюшу. А ў прышчэпленага класічная карціна коклюшу так і не выявіцца. Але менавіта на першым тыдні хваробы чалавек максімальна заразны, асабліва для дзяцей груднога ўзросту, бо сваю першую вакцыну яны атрымаюць у два месяцы, і калі мама не атрымала падчас цяжарнасці прышчэпку ад коклюшу, то дзіця стэрыльнае. І ў такіх дзяцей коклюш як правіла працякае ў рэанімацыі, з дыхальнай недастатковасцю і ўскладненнямі.

***— Сёлета пачнуць прышчэпліваць дзяўчынак з 11 гадоў супраць віруса папіломы чалавека (ВПЧ)...***

— На сёння вядома больш за 100 вірусаў папіломы чалавека. Частка з іх з'яўляецца правакатарам скурных утварэнняў — папілом, кандылом, бародавак. Іншыя атакуюць слізістыя палавых органаў. Гэта група папіломавірусаў уключае нізка- і высокаанкагенныя штамы. Пры інфіцыраванні нізкаанкагенымі штамамі інфекцыя спыняецца на стадыі папілом і кандылом, у адрозненне ад высокаанкагенных сератыпаў, пры заражэнні якімі існуе значная рызыка пераходу інфекцыі ў пухлінную трансфармацыю. Існуе па меншай меры 14 высокаанкагенных штамаў. Найбольш часта сустракаюцца 16-ы і 18-ы сератыпы. Менавіта яны і ўтрымліваюцца ў вакцыне. Сумарна яны адказваюць за 70 % выпадкаў раку шыйкі маткі. Далучэнне іншых штамаў павышае рызыку анкапаталогіі да 90 %. Безумоўна, вірус папіломы чалавека выклікае не толькі рак шыйкі маткі, але і анказахворванні іншых лакалізацый.

ЗДАРОВАЕ ЖЫЦЦЁ

# НЕБЯСПЕЧНАЯ ЗВЫЧКА

## Якім рызыкам падвяргае будучае дзіця цяжарная жанчына пры курэнні?



Нядаўна вучоныя высветлілі, што, калі жанчына курыла падчас цяжарнасці, у школе яе дзіця будзе паказваць горшыя вынікі. Аднак рызыкі ёсць яшчэ падчас выношвання плода і адразу пасля нараджэння дзіцяці. Пра іх расказвае ўрач-акушэр-гінеколаг 11-й гарадской паліклінікі Мінска Ірына БАРЫСЕВІЧ.

Як усім вядома, курэнне — шкодная звычка, аднак дарослы чалавек сам прымае рашэнне, курыць яму ці не. Дзіцяці ж, якія знаходзяцца ва ўлонні маці, пра гэты выбар не пытаюцца.

Урачы рэкамендуюць будучым мамам максімальна ўстрымлівацца ад курэння падчас цяжарнасці, а перад зачаццем і ў першыя дні — забяспечыць поўную адмову ад гэтай шкоднай звычкі. Такім чынам, прадухіляецца развіццё прыроджаных паракаў сэрца ў плода.

— Па выніках даследаванняў у маці, якія кураць у першым трыместры, рызыка нараджэння дзіцяці з паракам сэрца складае больш за 20 %. Цяжарная жанчына з кожнай выкуранай цыгарэтай павялічвае рызыку заўчасных родаў, — расказвае Ірына Барысевіч.

Аднак пералік магчымых ускладненняў шырэйшы. У акушэрскай практыцы комплекс сімптомаў ад неспрыяльнага дзеяння тытуню называецца «фетальным тытунёвым сіндромам». Ускладненні могуць развіцца як у самой жанчыны, так і ў плода, нярэдка паталогія выяўляецца пасля нараджэння дзіцяці і прагрэсіруе з узростам. Прычым электронныя цыгарэты, вейпы, айкасы і кальяны таксама шкодныя для дзіцяці.

— Нікацін і таксічныя прадукты гарэння, у прыватнасці чадны газ, трапляюць у кроў маці, а адтуль — у плацэнту і атручваюць плод. Сам па сабе нікацін звужае сасуды, што памяншае паступленне кіслароду і пажыўных рэчываў. Гэта можа прывесці да гіпаксіі плода, яго неданошанасці або няспеласці (маленькая вага пры даношанай цяжарнасці). Самае небяспечнае, што вынікам курэння можа быць унутрычэраўная гібель плода. І гэта страшны, але навукова абгрунтаваны факт, а не запалохванне, — звяртае ўвагу ўрач.

Дарэчы, шанц нараджэння мёртвага немаўляці пры курэнні падвойваецца. Рызыка спантаннага аборту ў жанчын, якія кураць, на 30—70 % вышэйшая, а рызыка развіцця выкідыша дасягае 96 %.

— Нікацін выклікае спазм сасудаў, прыводзіць да павелічэння вязкасці крыві амаль на 30 %, вынікам чаго з'яўляецца трамбоз сасудаў плацэнты і перапыненне цяжарнасці. Чадны газ, які паступае ў кроў пры курэнні, можа быць больш небяспечны, чым сам нікацін, бо, трапляючы ў кроў немаўляці, ён назапашваецца ў крывяных цельцах, робячы іх няздольнымі транспартаваць кісларод у тканкі. Пры гэтым пакутуюць самыя адчувальныя да кіслароднага галадання органы плода — мозг, ныркі, сэрца, — кажа Ірына Барысевіч.

Акрамя таго, курэнне неспрыяльна ўплывае на працэс закладкі і развіцця нервовай трубкі ў плода, вядзе да нараджэння анэнцэфалаў, немаўлят з прыроджанымі анамаліямі разумовага развіцця, з воўчай пашчай і заечай губой.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

Прыкметамі «памірання», абоператамлення, глебы з'яўляюцца: яе пылападобны бесструктурны стан, з'яўленне «скарынкі» пасля кожнага дажджу ці паліву, неўраджаі. Прыкметы «хваробы» — гэта непрыемныя пахі гнілі і цвілі. У такіх выпадках трэба тэрмінова праводзіць «рэанімацыю» глебы і яе «лячэнне».

# ЯК «АЗДАРАВІЦЬ» І «РЭАНІМІРАВАЦЬ» ГЛЕБУ

Пераварочваючы пласт зямлі пры перакопцы, мы «хаваем» усіх карысных мікробаў глебы, якія забяспечваюць яе ўрадлівасць. Мы «закопваем» іх так глыбока, што яны затыхаюцца без кіслароду і гінуць. А шматлікіх дажджавых чарвякоў мы проста «перасякаем» рыдлёўкай.

Ніколі не складайце гной у вялікую кучу, не давайце яму «загарацца» і згніць. Гэта супярэчыць усім прыродным «правілам».

Як жа быць? Па-першае, можна абысціся і зусім без гэтага, часам вельмі дарагога «ўгнаення», як гной. Але калі вы ўжо яго купілі, паступіце з ім разумна: раскладзіце тоўстым пластом, дзе гэта магчыма, дзе ён не «спаліць» карані раслін (напрыклад, не баяцца мульчыравання свежым гноем маліны, парэчкі...). Паступова ён пройдзе ферментатыўнае разлажэнне, як у прыродзе, пад уздзеяннем глебавай мікрафлоры і чарвякоў і ператворыцца ў якаснае гумінавае ўгнаенне. Але магчыма абысціся і таннейшым сродкам — любой арганічнай мульчай, і чым таўсцейшы пласт, тым лепш. Гэта цалкам будзе адпавядаць «агратэхніцы» прыроднага земляробства.

Мульча можа быць з любых даступных арганічных матэрыялаў: травы, лісця, пілавіння, мякіны, шалупіны, лускі і да т. п.

## У садзе

Лепшае ўтрыманне саду пад залужэннем. І для гэтага не патрабуецца пасеў нейкай адмысловай травы. Сад сам паступова зарасце зёлкавымі і канюшынай, калі вы рэгулярна, некалькі разоў за сезон будзеце скошваць усё, што вырасце з травянога покрыва.

Усе пустазельныя травы не цярпяць частага скошвання і паступова знікнуць з участка, а зёлкавыя і канюшына не баяцца гэтага. Скошаную траву нікуды не прыбірайце, пакіньце яе на месцы — гэта «ежа» мікробам і чарвякам.

Каб паскорыць працэс залужэння, пакідайце «астраўкі» пажаданых раслін, дайце ім выспець і рассеяць насенне. Гэта так проста.



## У агародзе

Перш за ўсё абмяжуйце чым-небудзь градкі: дошкамі, аполкам, чым заўгодна. Гэта не для раслін. Гэтаперашкода для вас, каб вы ніколі не наступалі на тую частку ўчастка, дзе будуць расці расліны. Тады вам не прыйдзецца рыхліць глебу.

Міжраддзі і праходы засыпце тоўстым пластом пілавіння, пяску — няважна, але гэта выключыць рост пустазельных траў і палегчыць догляд.

Самі грады. Калі глеба моцна суглінкавая, дадайце ў яе пясок, біякампост і старанна ўсё перамяшайце.

Далейшы догляд будзе заключацца ў рэгулярным веснавым унясенні біякампосту і лёгкім рыхленні садовымі віламі, без пераварочвання землянога пласта. Вось і ўсё.

Пасля таго як агароднiна падрасце, каб глеба моцна не высыхала, замульчыруйце паміж радкамі. Гэты прыём пазбавіць ад неабходнасці частых паліваў.

У ягадніку і ўсюды ў міжраддзях глебу засыпце пластом мульчы. Зрабіўшы гэта аднойчы, далей застанецца толькі папаўняць пласт мульчы. Такім чынам, вы створыце хату вашым памочнікам, і яны вярнуцца на ўчасткі, у сады і агароды.

Але можна і дапамагчы ім вярнуцца. Ідзіце ў найбліжэйшы лес, лесапаласу і набярыце некалькі дзясяткаў дажджавых чарвякоў, набярыце трохі верхняга пласта лугавой зямлі разам з ліставым і травяным ападам, прынясіце гэта ў свой сад і агарод і «выпусціце» ў прыгатаваную для іх хату — тоўсты пласт мульчы ў розных месцах. І яны вельмі хутка там расселяцца.

А далей нашы нябачныя памочнікі — мікробы, грыбы і чарвякі — усё зробяць самі, не трэба толькі ім перашкаджаць. Яны зробяць глебу больш друзлай, структурнай, «угнояць» яе самым лепшым чынам без усякіх хімічных угнаенняў.

## АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

# АД ЛЮБОВІ ДА НЯНАВІСЦІ...
## І наадварот

**Той вельмі даўні суботні вечар 13 студзеня выдаўся дужа ветраным, снежным... Але ж час варажбы ніхто не адмяняў?**

Сяброўкі-старшакласніцы Таня, Люда і Наташа найперш тройчы збегалі на вуліцу, каб паслухаць сабак і такім чынам даведацца, з якога боку чакаць сваіх суджаных. Загадалі на Люду — забрахаў «настрадамус» з усходняй вуліцы, на Наташу — з паўночнай, на Таню — і смех, і грэх — амаль побач, у дварышчы суседа Воўкі, аднакласніка і лютага ворага, бо чаго ён толькі не рабіў: змалку цягаў дзяўчынку за косы, падкладваў жаб у школьны партфель, «тапіў» у снежных сумётах, а каўнер закідваў хрушчоў, а калі падрос, стаў перахопліваць запіскі ад закаханага ў Таню Дзімы, складваць з іх самалёцікі і пускаць па класе...

Замуж за такога? Ды божа барані!

Наступная варажба была працягам першай. Кожнай з дзяўчат трэ было выйсці на вуліцу з блінам, аддаць яго першаму з сустрэчных мужчын і спытаць у яго імя (такое ж будзе, маўляў, і ў мужа).

Людка, абсыпаная снегам, вярнулася ў хату ні з чым (дакладней — з задубелым блінам), бо не дачакалася, не ўбачыла нікога, толькі намерзлася. Наташы пашчасціла больш: яна сустрэла (доўга пасля рагаталі) дзеда Юзеньку, які ішоў да свайго сябра гуляць у карты. Таня ж, згледзеўшы ў снежнай віхуры высокую мужчынскую постаць, спачатку падбегла ды выдала: «Варожым на суджанага. Вазьміце блінец. Скажыце, як вас...» І толькі потым пачула: «О, блін? — здзівіўся Воўка (а гэта быў ён). — Давай!.. Солі малавата...»

Ён, падобна, не мог яе не пакрыўдзіць!

Трэці, фінальны, этап варажбы праходзіў у лазні — са свечкамі, люстэркамі ды словамі: «Суджаны, з'явіся!»

Таня ў прадчуванні цуда клікала яго апошняй: шчыра шаптала запаветныя словы, старанна ўзіралася ў цьмянае люстэрка, а потым, неяк міжволі, зірнула ў блізкае акно і... закрычала ад страху, бо ўбачыла там страшэнную патлатую морду з расплюшчаным носам.

Як выскаквала з прылазніка, як ляцела ў хату, дзяўчына не помніла! Хіба пазней, крыху паспакайнеўшы, падумала, што гэта, напэўна ж, ён, Воўка, вырашыў паглядзець, што адбываецца ў лазні, і ўсё сапсаваў, паганец!

— Эх, не ўдалася ў нас варажба! — з сумам прызнала тады Таццяна і, магчыма, пра ўсё ў той вечар забылася б, калі б...

Калі б той самы Воўка праз чатыры гады не прызнаўся, што з самага маленства апроч яе дзяўчынак не бачыў і бачыць не хоча.

— Ты выйдзеш за мяне? — спытаў у дзяўчыны.

Адмовіць былому дэсантніку — такому дужаму, статнаму, смеламу і нясмеламу — Таццяна не змагла.

Чым гэта скончылася?

Ды вяселлем.

**А. Навасельская,** *Мінскі раён.*

## Надвор'е на заўтра

Апошняя чвэрць 21.01-28.01. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

| Горад | Ціск | Ноч | Дзень |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 759 мм рт.сл. | -1..+1°C | 0..+1°C |
| ВІЦЕБСК | 759 мм рт.сл. | 0..+2°C | 0..+2°C |
| МАГІЛЁЎ | 760 мм рт.сл. | 0..+1°C | 0..+2°C |
| ГОМЕЛЬ | 762 мм рт.сл. | -1..+1°C | +1..+2°C |
| ГРОДНА | 759 мм рт.сл. | 0..+2°C | +2..+3°C |
| БРЭСТ | 759 мм рт.сл. | 0..+1°C | +1..+3°C |

Паводле даных Белгідрамета

### Геамагнітныя ўзрушэнні

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

### ...у суседзяў

МАСКВА -1..+1°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +1..+3°C



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## 23 СТУДЗЕНЯ — Даты, Падзеі, Людзі

**У краіне**

**1793** год — адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай паміж Расійскай імперыяй і Прусіяй. Ён адбыўся ў перыяд пасля вайны прыхільнікаў Канстытуцыі і Таргавіцкай канфедэрацыі 1792 года і быў праведзены паміж Расійскай імперыяй і Прусіяй. Ратыфікаваны сеймам у 1793 годзе. Па гэтым пагадненні Расія атрымала беларускія землі да лініі Дынабург — Пінск — Збруч, усходнюю частку Палесся, украінскія вобласці Падолле і Валынь.

**1919** год — нарадзіўся (в. Якімаўка Рэчыцкага раёна) Анатоль Якаўлевіч Каваленка, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 года — лётчык разведвальнага авіяпалка. Удзельнік абароны Севастопаля, Ленінграда, Керчы. Здзейсніў 173 баявыя вылеты, знішчыў сем танкаў, 10 гармат, 15 вагонаў і 30 аўтамашын з ваенным грузам, 50 агнявых кропак, выявіў 23 аэрадромы, 15 абарончых рубяжоў, каля 50 пераправ, сфатаграфаваў 900 чыгуначных эшалонаў ворага, а ў паветраных баях збіў сем самалётаў праціўніка, яшчэ 16 знішчыў на зямлі.

**У свеце**

**1556** год — землятрасенне ў Шэньсі (Кітай). Загінула прыкладна 830 тысяч чалавек. Гэта самы смяротны землятрус у гісторыі чалавецтва.

**1783** год — нарадзіўся Стэндаль (Анры-Мары Бейль), французскі пісьменнік, адзін з заснавальнікаў псіхалагічнага рамана. Аўтар раманаў «Чырвонае і чорнае», «Пармскі манастыр», «Люсьен Левель», псіхалагічнага трактата «Пра каханне» і іншых.

**1895** год — упершыню на бераг Антарктыды сышлі людзі — капітан і пасажыр нарвежскага прамысловага судна «Антарктык».

**1903** год — нарадзіўся Рыгор Васільевіч Александраў, савецкі кінарэжысёр, народны артыст СССР. Адзін са стваральнікаў жанру савецкай музычнай камедыі. Паставіў фільмы «Волга-Волга», «Цырк», «Вясна». Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 781. Індэкс 63850. Зак. № 86.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 22 студзеня 2025 года.